Антоній
Мітрапаліт Суражскі

БЫЦЬ ХРЫСЦІЯНІНАМ



Антоній
Мітрапаліт Суражскі

БЫЦЬ ХРЫСЦІЯНІНАМ

М. А.

Фонд
«Духоўная спадчына
мітрапаліта Суражскага Антонія»

2014

УДК 281.9
ББК 86.372
А 72

Дапушчана да распаўсюду Выдавецкай Радай
Беларускай Праваслаўнай Царквы
Рашэнне №1722 ад 20.02.2014

Рэдактар-укладальнік Алена Майдановіч
Рэдактар беларускага перакладу Наталля Васілевіч
Пераклад з рускай мовы Цэнтр «Экумена» (Раман Абрамчук, Наталля Васілевіч, Уладзімір Лянкевіч, Ганна Міхальчук)
Мастацкае афармленне: Юлія Янюк-Казлоўская

Антоній, мітрапаліт Суражскі

А 72 Быць хрысціянінам.: М.: Фонд «Духоўная спадчына мітрапаліта Суражскага Антонія, 2014. — 112 с.

ISBN 978-5-903898-32-9

Цыкл гутарак, прамоўленых уладыкам Антоніем у 1995 годзе адмыслова для аўдыторыі ў Расіі, дапоўнены дакладам на тэму духоўніцтва (Масква, 1987) і гутаркай аб хрысціянскім жыцці (Лондан, 1990). У перакладзе на беларускую мову.

ББК 86.372

© Фонд «Духоўная спадчына мітрапаліта Суражскага Антонія», 2014
© Цэнтр «Экумена», пераклад на беларускую мову, 2014
© Ю. Янюк-Казлоўская, 2014

ISBN 978-5-903898-32-9

Ад выдаўцоў

Мітрапаліт Антоній (Блум) нарадзіўся ў 1914 г. Ранняе дзяцінства правёў у Персіі, дзе ягоны бацька быў расійскім консулам. Пасля рэвалюцыі сям'я некалькі гадоў блукала па Еўропе і ў 1923 г. асела ў Парыжы. Будучы мітрапаліт скончыў тут сярэднюю школу, потым біялагічны і медыцынскі факультэты Сарбонскага ўніверсітэта. У 1939 г., перад сыходам на фронт хірургам французскай арміі, таемна прынёс манаскія абяцанні; у мантыю з іменем Антоній быў пастрыжаны ў 1943 г. У гады нямецкай акупацыі — лекар у антыфашысцкім руху Рэзістанс. Пасля вайны працягваў медыцынскую практыку, у 1948 г. прыняў святарскі сан і быў накіраваны на пастырскае служэнне ў Вялікабрытанію. Епіскап (1957), Мітрапаліт і Патрыяршы Экзарх Заходняй Еўропы (1966). Вызвалены ад гэтай пасады па ўласнай просьбе ў 1974 г. З гэтага часу цалкам прысвяціў сябе духоўнаму стырнаванню паствы сваёй епархіі, якая колькасна павялічвалася, а таксама ўсіх, хто звяртаўся да яго за парадай і дапамогай. Спачыў мітрапаліт Антоній 4 жніўня 2003 г.

Цыкл гутарак, прамоўленых уладыкам Антоніем адмыслова для аўдыторыі ў Расіі (жнівень 1995 г.), дапоўнены двума тэкстамі: выступам на тэму духоўніцтва (2-я Міжнародная канферэнцыя напярэдадні святкавання Тысячагоддзя Хрышчэння Русі, 1987 г.) і гутаркай пра хрысціянскае жыццё

ў лонданскім прыходзе (травень 1990 г.). Нагадаем, што ўладыка Антоній ніколі не пісаў сваіх тэкстаў, а прамаўляў «ад сэрца да сэрца», з глыбіняў свайго досведу жыцця з Богам, шчодра дзелячыся з кожным чалавекам усім, чым жыў сам. Гэтае выданне — пераклад гутарак мітрапаліта Антонія на беларускую мову — з захаваннем аўтарскага стылю жывога маўлення, звернутага непасрэдна да суразмоўцы. Даклад пра духоўніцтва друкуецца ва ўхваленай аўтарам рэдакцыі (ён перавыдаваўся неаднаразова). Гутарка пра хрысціянскае жыццё друкавалася ў зборніку «Шляхі хрысціянскага жыцця» (М., 1998).

Пра хрысціянства

Мне прапанавана тэма пра хрысціянства: што значыць «быць хрысціянінам» і як быць хрысціянінам у сучасным свеце.

У нейкім сэнсе, быць хрысціянінам вельмі проста. Хрысціянін — гэта вучань і сябар Хрыста; два гэтыя паняцці сумежныя, хоць ёсць і адрозненні. З аднаго боку, мы — вучні Хрыстовыя, Ягоныя паслядоўнікі, і пагэтаму павінны вучыцца ад Яго праз Евангелле таму, у што Ён верыць, таму, як Ён вучыць нас жыць. Я не выпадкова скарыстаў выраз «у што Ён верыць». Неяк у Расіі малады афіцэр на прыступках маскоўскага гатэля «Украіна» запытаўся ў мяне: «Добра, вы верыце ў Бога. А вось Бог — у што Ён верыць?». І я яму адказаў: «Бог верыць у чалавека».

Гэта найпершы момант у хрысціянскім жыцці: разам з Богам верыць у чалавека, пачынаючы з сябе самога. Хрыстос не выпадкова гаворыць, што мы павінны любіць бліжняга, як самога сябе. Любіць — значыць быць гатовым рабіць усё магчымае дзеля таго, каб любімы чалавек радаваўся ў жыцці, рос у поўную меру сваіх здольнасцяў і быў варты свайго чалавечага звання. Таму першае, чаму нас вучыць Хрыстос, калі мы становімся ягонымі вучнямі, гэта — верыць у чалавека, спадзявацца на ўсё ад яго і любіць яго, нават коштам уласнага жыцця.

Зноў-такі, калі я кажу «коштам уласнага жыцця», гэта не абавязкова значыць смерць, таму што мож-

на цэлае жыццё аддаць дзеля аднаго чалавека альбо якой-небудзь групы людзей без таго, каб памерці ад гэтага, у простым сэнсе слова, цялесна. Пакутнікі памíралі целам, гэтым сведчылі аб сваёй веры ў Хрыста. Але мы часта павінны выміраць і паміраць дзеля таго, каб іншы чалавек мог дыхаць вольна, ажыць, знайсці прастору ў сваім жыцці. Інакш кажучы: павінны ахвяраваць сабою, забыць пра сябе дзеля таго, каб памятаць пра іншага чалавека. Ніхто не мае большай любові, чым той, хто жыццё сваё гатовы аддаць дзеля свайго бліжняга. А жыццё можа быць доўгім, цяжкім, калі чалавек не думае ні аб чым, што датычыць яго, а толькі пра мажлівасць служыць іншаму чалавеку, іншым людзям. Гэта першы крок: быць вучнем Хрыста — значыць верыць у чалавека; як у сябе, так і ва ўсіх іншых.

Але верыць — значыць, мы перакананыя, што ў кожным чалавеку ёсць святло, ёсць дабро. Святло ў цемры свеціць; цемра не заўжды гэтае святло прымае, але цемра не ў стане агарнуць альбо згасіць святла. Святло мае самабытнасць, моц, жыццё; а цемра ж — адсутнасць усяго гэтага; гэта вельмі важна сабе ўявіць.

Вядома, акрамя гэтага мы знаходзім у Евангеллі шмат указанняў на тое, якім чынам ажыццяўляць сваю веру ў чалавека разам з Богам, як мы можам разам з Богам спадзявацца да апошняга імгнення на тое, што нават злачынца можа стаць вартым свайго чалавечага звання. І гэта адбываецца. Здараецца, што чалавек пражыве нягодна ўсё сваё жыццё, а апынуўшыся сам-насам з верагоднасцю смерці, больш за тое, з пэўнасцю, што смерць яму паграー

жае, ураз апамятаецца і стане зусім іншым чалавекам. Чалавек можа пражыць злачынцам і памерці праведнікам. Гэта мае на ўвазе святы Серафім Сароўскі, калі гаворыць пра тое, што пачатак жыцця, раннія гады дзяцінства і канец жыцця — пераважна спакойныя, светлыя і гожыя, аднак у сярэдзіне жыцця бывае суцэльная бура. З гэтым мы мусім лічыцца, калі думаем пра сябе і пра іншых.

Часта гавораць: дзеля таго, каб быць хрысціянінам, трэба выконваць запаведзі Хрыста. Безумоўна, аднак запаведзі Хрыста — не загады, якія Ён нам дае: маўляў, трэба пражыць так, трэба пражыць гэтак, а калі пражывеш такім чынам, то будзеш за гэта пакараны… Не, запаведзі Хрыста — гэта Яго спроба нам вобразна паказаць, якімі б мы маглі быць, калі стаць і быць сапраўдным, годным чалавекам. Таму запаведзь Хрыста — гэта не загад, а адкрыццё перад нашымі вачыма таго, якімі мы пакліканы быць і можам быць; якімі нам, адпаведна, і належыць быць.

Я ўзгадваў таксама, што мы павінны быць не толькі вучнямі Хрыста, але і Ягонымі сябрамі. Бывае, да мяне на споведзь прыходзіць дзіця год сямі-васьмі і прыносіць цэлы спіс грахоў. Я слухаю і пасля звычайна пытаю: «Скажы, ты сам адчуваеш сябе вінаватым ці паўтараеш мне тое, у чым цябе папракаюць твае бацькі?» — «Не, мама мне казала, што я павінен спавядацца ў тым ці гэтым, бо гэта яе злуе, гэтым я парушаю спакой сямейнага жыцця». Я на гэта адказваю: «Цяпер забудзься пра гэта; не аб тым гаворка. Ты не прыйшоў расказваць мне, на што злуюцца твае маці ці бацька. Скажы лепш вось што: Ты пра Хрыста што-небудзь ведаеш? Ты чытаў

Евангелле?» — «Ну, мне мама і бабуля распавядалі, і я штосьь чытаў ды ў царкве чуў». — «А скажы: табе Хрыстос падабаецца як чалавек? Ты хацеў бы з Ім пасябраваць?» — «Так!» — А ты ведаеш, што значыць «быць сябрам»? Сябар — чалавек, адданы іншаму ва ўсялякіх жыццёвых абставінах, які гатовы ўсё рабіць дзеля таго, каб яго не расчараваць, яго не падмануць, застацца з ім, нават, калі ўсе астатнія ад яго адвернуцца. Сябар — чалавек, верны да канца. Вось уяві: калі б Хрыстос быў хлопчыкам у тваёй школе і ўвесь клас супраць Яго паўстаў, што б ты зрабіў? У цябе хапіла б сяброўства, а гэта значыць вернасці і адвагі стаць побач з Ім і сказаць: калі хочаце Яго біць, біце і мяне, бо я з Ім…. калі ты можаш сказаць пра Хрыста, што гатовы быць такім сябрам, то можаш далей ставіць перад сабою пытанні. Чытай Евангелле, стаў перад сабою пытанні пра тое, як можна так пражыць, каб Яго ў табе самім не расчараваць. Як можаш ты так пражыць, каб Ён радаваўся за цябе, радаваўся, калі бачыў, які ты чалавек, якім ты стаў дзеля гэтага сяброўства. Ты разумееш гэта?» — «Так». — «І ты гатовы на гэта ісці?» — «Так»… Дык вось, у гэтым — усё хрысціянскае жыццё. Усё хрысціянскае жыццё заключаецца ў тым, каб быць верным сябрам Хрыста і заўжды вучыцца таму, што Ён любіць, а што для Яго агідна, што прывяло Яго да смерці, — і адпаведна сябе паводзіць.

Калі перанесці гэтыя пытанні і гэтыя пачатковыя адказы на сучаснае жыццё, то можна бачыць, што гэта значыць. У раннія вякі хрысціянства быць сябрам Хрыстовым, быць верным Яму, лаяльным Яму, значыла быць гатовым перад людзьмі,

якія ненавідзелі Яго, перад ганіцелямі веры, якую Ён прапаведаваў, сказаць: «Я адзін з іх!» — і, пры неабходнасці, пацярпець. І не толькі самому пацярпець, бо ў старажытнасці пацярпець за Хрыста лічылася за гонар, лічылася самым найлепшым, што можа адбыцца ў жыцці. Ёсць вельмі кранальны аповед у жыціях святых. У Рыме да Калізея імчыцца жанчына і сустракае свайго знаёмага, які яе спыняе: «Куды ты бяжыш? Там хрысціян катуюць!» — «Так, — адказвае яна, — я хачу памерці разам з імі». — «Але нашто ты туды цягнеш свайго малога?» — «А як жа! Няўжо я пазбаўлю яго радасці памерці за Хрыста!» Вось так ставіліся ў старажытнасці. У наш час нам не паграЖае смерць так наўпрост, але перад намі ўвесь час паўстае пытанне: ты з Хрыстом ці супроць Яго? Нават у самых дробных рэчах: ты гатовы хлусіць? Ты гатовы падманваць праз баязлівасць, дзеля выгады?.. Калі ты гатовы гэта рабіць, ты не вучань Хрыста. Ты гатовы забыць пра патрэбу іншага чалавека, таму што яна невыгодная для цябе альбо патрабуе ад цябе намаганняў, якія ты не гатовы прыкласці? Ты не вучань Хрыста… Быць вучнем Хрыстовым не значыць увесь час здзяйсняць якія-небудзь гераічныя ўчынкі; гэта значыць штодня гераічна здзяйсняць дробныя ўчынкі; мець думкі чыстыя, вартыя той любові, якую Бог да цябе мае; мець праўду жыцця, наколькі гэта магчыма, нават з небяспекай, нават з рызыкай; гэта значыць — не саромецца свайго звання хрысціяніна, быць гатовым перад людзьмі сказаць: «Так, я Хрыстовы, калі хочаце адмовіцца ад мяне, адмаўляйцеся, але я не адыйду ад Хрыста дзеля таго толькі, каб застацца з вамі». І гэта вельмі істотна.

Гераічныя ўчынкі нам даюцца рэдка, а штодзённы гераізм не патрэбны. Шмат гадоў таму айцец Сергій Булгакаў напісаў артыкул «Гераізм і падзвіжніцтва». Ён гаворыць пра тое, што гераізм — гэта момант, калі чалавек здзяйсняе адзін учынак, якім можа скончыцца яго жыццё альбо які прынясе перамогу; а падзвіжніцтва — гэта тая форма жыцця, пры якой чалавек пастаянна вучыцца ў Хрыста, як жыць, пастаянна прапускае ў сваю душу святло Хрыстовае, пастаянна імкнецца жыць годна, быць вартым свайго чалавечага звання, быць вартым Хрыста.

А калі паставіць пытанне пра тое, што такое чалавечае званне, зноў-такі паўтаруся: паглядзі на Хрыста. Ён — адзіны ва ўсёй гісторыі чалавецтва ў поўным сэнсе Чалавек. Чалавек без аніякіх дадатковых словаў, проста Чалавек у поўным сэнсе слова. Чалавек настолькі вялікі, настолькі празрысты, так адкрыты Богу, што Бог і Ён зліваюцца ў адно, злучаюцца ў адно, але без таго, каб Чалавек перастаў быць самім сабой. Гэта вельмі істотны момант. У вучэнні пра Уцялесненне Хрыста гэта адыгрывае каласальную цэнтральную ролю. Мы верым у тое, што Бог стаў чалавекам, уцялесніўся, але што Ісус, народжаны ад Дзевы, не перастаў быць у поўным сэнсе чалавекам, падобным да нас. І калі мы ставім пытанне пра тое, як гэта мажліва, як можа Боскасць і чалавецкасць злучацца гэткім чынам, ёсць адказ у святога Максіма Вызнаўцы. Ён кажа, што Боскасць і чалавецкасць злучыліся ў Хрысце, падобна да таго, як агонь пранізвае жалеза, ускладзенае на жароўню. Ты ўскладаеш на жароўню меч шэрым, цьмяным; выцягваеш — ён увесь гарыць святлом

і агнём: жалеза і агонь настолькі пранізаныя адно адным, што ўжо можна рэзаць агнём і паліць жалезам... І вось, мы пакліканыя так злучыцца з Хрыстом, каб Ягонае жыццё стала нашым жыццём. У таемствах, пра якія мы будзем размаўляць крыху пазней, прысутнічае менавіта гэты момант. Мы злучаемся з Хрыстом, нашае цела робіцца целам Хрыста і ў кожным асобным чалавеку, і ў сукупнасці ўсіх людзей, — настолькі, што айцец Сергій Булгакаў мог сказаць, што хрысціянская Царква з'яўляецца прысутнасцю ўцялесненага Хрыста на зямлі, таму што мы ўсе робімся членамі, часцінкамі Ягонага Богачалавечага Цела. Вось што значыць быць хрысціянінам.

Як гэта ажыццяўляць практычна цягам усяго свайго жыцця на зямлі? Гэта і складана, і проста. Калі гаварыць агульнымі словамі, безумоўна, гэта вымагае велічэзнага развіцця паняццяў; але калі гаварыць пра сябе, пра сваё жыццё, то гэта бывае так проста, хаця часам гэтая прастасць бывае вельмі страшнай. У мяне быў сябар, старэйшы за мяне год на дзесяць. Калі ён быў студэнтам у Парыжы, ён заўжды жаліўся на тое, што ён такога высокага росту, шырокі ў плячах, што не можа незаўважным быць. Памятаю, неяк у метро хлапчук яго тузануў за рукаў і кажа: «Дзядзьку, табе хіба не сумна адному там, наверсе, стаяць?» — бо хлопчык быў маленечкі, а Валодзя быў вельмі рослы. А надышла вайна, і я ад яго атрымаў ліст, у якім ён між іншым пісаў: «Я заўжды наракаў на тое, што я такі шыракаплечы і рослы, а зараз я так цешуся з гэтага: калі бывае страляніна, то два чалавекі могуць схавацца

за маёй спінай». Гэта былі не словы, бо ён быў на фронце, у яго рэальна стралялі, і ён аддаваў жыццё. Ён не быў забіты, але жыццё ён усё адно аддаваў; тое, што гэтае жыццё ў яго не адабралі, не азначае, што ён не быў гатовы яго пакласці «за другі своя», гэта значыць за іншага чалавека, — не за асабістага сябра, а за таго жаўнерыка, які за ім можа схавацца. У такім разе мы можам цягам усяго нашага жыцця і ў вялікім, і ў малым быць — не героямі, таму што гэта бывае зрэдку, а падзвіжнікамі, якія ўвесь час рухаюцца па рэчышчы, увесь час рухаюцца да таго, каб быць усё больш і больш падобнымі да Хрыста, усё больш радаваць Яго тым, што мы робімся падобнымі да Яго, усё святлеем, прымаючы ў сябе рысы Ягонае асобы і навучаючыся таму, што для Яго агідна і што для Яго — радасць.

Я ўспамінаю святара, маладога тады (мне ён здаваўся вельмі лядашчым, бо сам я быў хлопчыкам дзесяці год), які мяне вельмі ўразіў. Я яго назаву, бо трэба памятаць такіх людзей: айцец Георгій Шумкін. Ён быў святаром нашага дзіцячага летніка, і нас, хлопчыкаў, дзівіла, што ён умеў усіх нас любіць без разбору. Калі мы былі «добрымі», ягоная любоў была святочнай радасцю; калі мы адступаліся ад Божае ласкі, рабіліся дрэннымі, благімі, ягоная любоў не мянялася, толькі рабілася вострым болем у ім, болем, які нас вылечваў і перамяняў. Я тады пра Бога нічога не ведаў, але гэта мяне ўразіла і засталося ў маёй памяці і ў маім сэрцы; і раскрылася толькі тады, калі я пра Бога даведаўся. Так, Бог нас гэтак любіць: Ён святочна радуецца — і Ён памірае на крыжы… І гэтая смерць Хрыста на крыжы (так-

сама, як і востры боль у душы і ў сэрцы айца Георгія Шумкіна) можа быць адраджэннем нашым і адраджэннем іншых людзей, бо многія з нас перамяніліся ад таго, што не маглі стрываць, не маглі бачыць, як Ён пакутуе.

Вось што, як мне здаецца, у простых словах і ў маштабе звычайнага простага жыцця, значыць быць хрысціянінам у сучасным свеце.

Пра царкву

Адзін істотны момант хрысціянства — тое, што Сам Хрыстос нічога не напісаў. Евангелле, якое мы маем, гэта памяць Царквы, памяць самых блізкіх вучняў Хрыста аб тым, што яны перажылі, чаму навучыліся падчас стасункаў з Ім; але Сам Хрыстос не пакінуў пасля Сябе кнігі, як пакідалі шматлікія іншыя настаўнікі. Што ж Ён пасля Сябе пакінуў? Ці ведаем мы з пэўнасцю, што Ён казаў, чаму навучаў, якім быў Ягоны вобраз? Так, ведаем, і нашмат больш пэўна, чым калі б у нас была кніга, у якую мы «ўчытвалі» б тое, што нам хочацца ў ёй пабачыць, як мы пастаянна робім, чытаючы творы розных пісьменнікаў: мы бачым сябе ў іх і ўспрымаем кнігу толькі ў меру свайго разумення. Хрыстос не пакінуў кнігі, але пакінуў жывую супольнасць, якая называецца Царквой і якая Яго асабіста ведае.

Я кажу «ведае», а не толькі «ведала», бо з веку ў век усе тыя, хто стаў вернікам, гэта людзі, якія так ці інакш сустрэліся з Хрыстом, і яны могуць паўтарыць словы аднаго з Пасланняў апостала Яна: «Пра тое, што мы чулі [...], што бачылі на свае вочы, што і разглядалі, і што краналі рукі нашыя [...], абвяшчаем вам (1 Ян 1:1-3); мы гаворым пра тое, што для нас абсалютна несумненная рэчаіснасць у межах нашага досведу. Гэта з веку ў век здараецца з незлічоным мноствам людзей. І трэба памятаць, што Царква —

не проста супольнасць людзей, аб'яднаных, як гаворыцца ў Катэхізісе, догматамі, царкоўнай іерархіяй і таемствамі. Вядома, што ўсё гэта ёсць у Царкве і з'яўляецца як бы ейным складнікам, але ёсць у Царквы і іншы стрыжань — сустрэча, сустрэча сам-насам з Хрыстом. Гэтая сустрэча можа ўзрушыць альбо можа адбыцца спакваля, ледзь прыкметна, але яна заўжды мае здзейсніцца, каб чалавек мог сказаць: «Я — вернік».

Але тут ёсць момант, які мне здаецца вельмі істотным. Вера як досвед сустрэчы з Богам — невыяўная. Перадаць тое, што адбылося, немагчыма; чалавечай мовай можна выказаць толькі тое, што ўласціва мове, нашаму ўспрыняццю. Я вам распавяду шчыра, хоць, можа, недарэчы, што са мною здарылася, і потым перайду да пытання пра тое, як вера можа выявіцца.

Я нарадзіўся да першай сусветнай вайны. Мой досвед жыцця ўтрымлівае ўсе трагічныя гады жыцця Расіі і замежнай эміграцыі. Акалічнасці былі такімі, што я аніякага царкоўнага ці нават хрысціянскага вучэння не чуў. На эміграцыі я жыў у закрытай школе, выходзіў з яе толькі на некалькі гадзін у нядзелю; тады было не да таго, каб мяне вучыць, — тады мяне трэба было суцешыць, узрадаваць. І таму я пра Бога аніякага паняцця не меў. Я ведаў, што мае бацькі вераць у Бога, але апроч таго не ведаў нічога. І так доўжылася даволі доўга.

Я паступіў хлопчыкам у рускую моладзевую арганізацыю. Там быў айцец Георгій Шумкін, пра якога я казаў у мінулай гутарцы; ён адкрыў мне таемства ўсёпераможнай любові, — любові, якая

можа быць радасцю і крыжовай пакутай. Але гэта я ўспрыняў толькі як ягоную асабістую, незразумелую мне ўласцівасць. Потым прайшлі гады. Пра Бога я чуў, але не цікавіўся Ім.

І вось аднойчы, падчас гульні ў валейбол, да нас, хлопчыкаў гадоў чатырнаццаці, падыйшоў наш кіраўнік і сказаў: «Вось, хлопцы, мы запрасілі святара правесці з вамі гутарку, бо надыходзіць Тыдзень пакутаў Гасподніх, ідзіце ў залу». Усе адмовіліся, і я ў тым ліку асабліва рэзка. Іншыя былі хоць у нейкай ступені звязаныя з царквой, а я ніяк не быў абазнаным у гэтай сферы і адказаў, што я ані ў Бога, ані ў святароў не веру і аніякага жадання не маю кудысьці ісці вучыцца таму, што мне абсалютна не патрэбна. Кіраўнік мой быў разумным, ён не сказаў, што гэта будзе добра для маёй душы, — я б яму адказаў, што ў мяне душы няма, таму мне не патрэбны святар. Кіраўнік мне сказаў: «Уяві сабе, што напляце ў Парыжы гэты святар, калі ніхто з вас не пойдзе на ягоную гутарку! Я цябе не прашу слухаць, ты пайдзі, сядзь у кут і думай свае думкі». Я вырашыў, што з паслухмянасці да арганізацыі магу гэта зрабіць; пайшоў, сеў у кут і збіраўся думаць свае думы. Але, на маё няшчасце (а, магчыма, шчасце), высветлілася, што святар гаварыў занадта голасна і мне замінаў думаць; а тое, што́ ён гаварыў, пачало мяне абураць да такой ступені, што я стаў прыслухоўвацца. Нас тады рыхтавалі да таго, каб са зброяй у руках вярнуцца і выратоўваць Расію ад бальшавізму, а ён плёў нам пра Хрыста, — пра пакорлівасць, пра цярпенне, пра рахманасць, пра ўсе цноты, да якіх нам аніякай справы не было, таму што яны ніякай, як

нам здавалася, карысці не прынеслі б нашай справе. Я слухаў з абурэннем, якое ўсё большала; калі ён скончыў сваю гутарку, я не вярнуўся на поле гульні, але паімчаўся дадому і папрасіў маці даць мне Евангелле, таму што мне хацелася асабіста пераканацца. Я памятаю свае словы да яе: «Я хачу праверыць, бо калі ў Евангеллі сказана тое, што гаворыць гэты святар, то я скончыў з Богам, скончыў з Хрыстом і выкіну свой хрысцільны крыжык». Перад тым, як чытаць, паколькі я быў хлопчык разумны, я ўзгадаў, як бацюшка казаў, што ёсць чатыры Евангеллі; з гэтага я зрабіў выснову, што адно павінна быць карацейшым за іншыя, і калі ўжо траціць час на чытанне Евангелля, то прачытаю самае кароткае. І тут я патрапіў у пастку — не да бацюшкі, а да Бога, таму што я пачаў чытаць Евангелле ад Марка, якое было прадугледжана для такіх хлопчыкаў, як я, дзікуноў. Я пачаў чытаць, і між першым і трэцім раздзелам, якія я чытаў марудна, бо нязвыклай для мяне была састарэлая мова нават рускага сінадальнага перакладу, раптам адчуў, што з таго боку стала, за якім я чытаю, стаіць жывы Хрыстос. Я Яго не ўбачыў, я не адчуў ніякага паху, не чуў нічога. Я адкінуўся на сваім крэсле, пераканаўся, што гэта не відзеж, не галюцынацыя, а цалкам простая пэўнасць, што Ён тут стаіць. І тады я падумаў: калі гэта так, то ўсё, што сказана пра Яго, напэўна, праўда; калі Ён памёр і зараз жывы, значыць, Ён — Той, пра Каго казаў айцец Сергій...

Я пачаў чытаць Евангелле ўжо выбарна, і некалькі рэчаў тады мяне асабліва ўразілі. Я звыкся разглядаць жыццё як джунглі, кожны чалавек быў для

мяне небяспекай, ворагам; каб выжыць у джунглях ранняй эміграцыі, трэба было скамянець, стаць цвёрдым, непранікальным. І раптам я бачу, што ў Евангеллі ад Мацьвея сказана: Бог загадвае сонцу Свайму ўзыходзіць над злымі і добрымі (гл. Мц 5:45). Я падумаў, калі Бог любіць добрых і злых, а я хачу быць з Богам, то павінен таксама пачаць любіць не толькі добрых, якія мяне любяць і добрыя да мяне, але і злых, якіх я так баюся і дагэтуль ненавіджу. Я задумаўся над гэтым і пастанавіў: добра, што б людзі ні рабілі, я іх буду любіць дзеля таго, каб застацца з Хрыстом; хай яны мяне хоць варам абварваюць, я ўсё адно не адмоўлюся ад гэтае любові… На наступны дзень, калі я выйшаў на вуліцу, я глядзеў на натоўп людзей, які кіраваўся на вакзал (мы тады жылі за горадам), і думаў: Бог іх усіх стварыў, Ён усіх любіць, і я ўсіх буду любіць… Гэта было маё першае ўражанне. Да канца выявіць я гэта не магу, я магу толькі апісаць у такіх бедных словах тое, як гэта на мяне паўплывала, але перадаць, што адбылося ў маёй душы ад таго, што я раптам апынуўся сам-насам з Хрыстом, я ніякім чынам не магу.

Што ж гэта значыць? Гэта значыць, што вера, паводле слова Апостала, ёсць упэўненасць у нябачным (Яўр 11:1). Хрыста я не бачыў, але я Яго сустрэў, і абсалютна ўпэўнены ў гэтым і дасюль, амаль праз восемдзесят год, як я быў упэўнены тады.

Але пасля мне давялося выяўляць сваю веру, перадаваць яе. І праз шмат гадоў мне патрапілася кніга святога Макарыя Егіпецкага, дзе ён робіць адрозненне між досведам веры і выяўленнем яго ў словах. Ён гаворыць: уявіце сабе, што цёмнай

ноччу вы лежыцё ў чоўне, які нясе рака ці мора. Над вамі бяздонныя нябёсы, зоркі, вас гойдае вада, і вы ўсёй сутнасцю перажываеце гэтае калыханне. А потым пачынаецца адліў, і ваш човен садзіцца на пясок. У гэты момант вы ўжо не адчуваеце болей гайдання чоўна, якое вас закалыхвае, але ва ўсёй вашай існасці яно працягвае прысутнічаць. Вы ведаеце, што яно было, вы ўсё яшчэ адчуваеце яго ў сабе. Гэта і ёсць момант, калі з досведу веры мы можам перайсці ў яе выяўленне, можам пачаць гаварыць пра тое, што перажылі ўсім целам, усёй душой.

І гэта істотны момант у Царкве. Усе апосталы, усе святыя, усе грэшнікі, якія калі-небудзь дакрануліся хаця б крыса шатаў Хрыстовых, могуць сказаць: у той момант штосьці са мной здарылася, у той момант я нешта перажыў, адчуў, і магу паспрабаваць вам гэта перадаць неяк ускосна… А што значыць «ускосна»? Мы ўсе умеем гаварыць, але перадаць — як гэта магчыма? Няўжо чалавек проста паверыць мне ці каму-небудзь з нас толькі таму, што мы скажам: «Гэта са мною здарылася»? А можа быць, ты падманваеш, можа, ты памыліўся, можа, табе гэта падалося. Як гэта вытлумачыць?..

І вось тут мне ўзгадваецца аповед з Евангелля пра тое, як Хрыстос з'явіўся пасля Свайго Уваскрэсення дзесяці вучням (Юда ўжо згінуў, а Фамы з імі не было). Яны сустрэлі Хрыста і ўсцешыліся тым, што Ён жывы, што смерць над Ім не мае ўлады, што Ён перамог зло, смерць; перамога належыць Яму. А потым вярнуўся Фама, і астатнія яму пачалі распавядаць пра тое, што бачылі ўваскрэслага Хрыста. Ён скінуў вачыма на іх і адказаў: калі не ўкладу пальца майго

ў раны ад цвікоў, не паверу (Ян 20:25). Чаму? Бо, гледзячы на іх, ён пабачыў, што з імі нічога істотнага не адбылося. Так, яны ўсцешыліся, але засталіся тымі ж самымі вучнямі, якімі былі раней. Пераіснення ў іх Фама не пабачыў. Гэтае пераісненне адбылося пазней, калі яны прынялі дар Святога Духа. Але да гэтага Фама не мог паверыць іхнім словам, таму што не пабачыў у іх рашучай ды вырашальнай перамены.

І вось гэта адбываецца з намі пастаянна. Між намі, грэшнікамі, якія часам свецяць малым святлом (як свечка можа гарэць на гарышчы?), і святымі, якія ззяюць, як святы Серафім Сароўскі праззяў перад вачыма Матавілава, розніца, безумоўна, каласальная. Але калі чалавек можа праз нас, у нас пабачыць нейкае святло, калі ён, гледзячы на нас, пабачыць, што мы не такія, як усе людзі, што з нас ліецца святло вечнага жыцця, тады ён можа паверыць нашаму слову, дакладней, нават не слову, — паверыць нам. Адзін хрысціянскі пісьменнік гаворыць, што між нявернікам і вернікам павінна быць такая ж каласальная розніца, як між вылепкам, статуяй і жывым чалавекам. Статуя можа быць цудоўнай, цудоўнейшай за ўсялякага чалавека, але яна застаецца дрэвам альбо каменем. Чалавек можа быць несамавітым, але ў ім нешта ззяе Боскім святлом. І гэты пісьменнік гаворыць, што калі няверанік сустракае верніка, ён павінен спыніцца і ўсклікнуць: «Што здарылася? Я чакаў сустрэць статую, а перада мною статуя, якая ажыла, яна жывая, рухаецца, яна мне перадае штосьці, чаго я ніколі не бачыў!».

Вось гэта — існасць Царквы ў асобе кожнага чалавека, па меры яго набліжэння да Хрыста, прылу-

чэння да Хрыста, прыняцця Святога Духа, у гэтым розніца між вернікам — і нявернікам, чужым Царкве. Але «чужы» чалавек таксама з'яўляецца чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова. Гэта чалавек, які, як сухія дровы, чакае моманту, калі іскра ўпадзе, і ён сам запаліцца. Ён не «абесчалавечаны» сваім няверʼем, гэта чалавек, які яшчэ не знайшоў паўнаты жыцця. І нам, вернікам, нам, якія сустрэлі Бога і Хрыста, належыць ззяць такім святлом, праменіць такое святло — не абавязкова асляпляльнае — можа быць, што і святло маленькай свечкі, але якое змусіць тых, хто з намі сустракаецца, сказаць: «У гэтым чалавеку ёсць нешта, чаго раней я ні ў кога не сустракаў!».

Гэта — існасць Царквы, гэта — ейная сапраўдная прырода. Царква тады робіцца тым, чым яна па сутнасці ёсць: целам Хрыста, інакш кажучы, доўжаннем праз тысячагоддзі і вякі ўцялесненай прысутнасці Бога, плоццю Сына Божага, прапанаванай нам у таемствах, і прысутнасцю Святога Духа. Царква — абʼяўленне Хрыста, абʼяўленне Святога Духа, абʼяўленне вечнага жыцця. Царква — месца, дзе Бог і чалавек злучаныя, месца, дзе Бог можа сустрэць чужога да гэтага часу Яму чалавека; і сам цуд гэтай сустрэчы. Вось што такое Царква.

Пра таемствы

Зараз гаворка пойдзе пра таемствы Царквы: і для таго, каб зразумець іх значэнне, трэба паглыбіцца крыху больш, чым я гэта рабіў на мінулай гутарцы, у разуменне самой Царквы. Царква — гэта Богачалавечая супольнасць, дзе прысутнічае паўната Боства, таксама як паўната чалавецтва; разам з гэтым Царква з’яўляецца чалавечай супольнасцю на шляху да збаўлення. Гэта я хачу патлумачыць.

Боская прырода Царквы вызначаецца тым, што першы яе член — гэта Госпад наш Ісус Хрыстос і ў Ім прысутнічае ўся паўната Боства цялесна (Кал 2:9). Апроч гэтага, дзякуючы таму, што Хрыстос прысутнічае ў Царкве паўнатой Сваёй чалавецкасці і паўнатой Сваёй Боскасці, Царква з'яднаная неразлучна і з Богам Айцом, і са Святым Духам, Які пасланы ў яе і ёй у дзень Пяцідзесятніцы, і прысутнічае ў Царкве ў двух відах: з аднаго боку, дасканалая чалавечасць, якой мы яе бачым у Хрысце, з іншага боку — недасканалая чалавечасць, якую мы самі сабой ўяўляем як паасобку, так і ўсе разам.

Таму пра Царкву можна сказаць, што яна — Богачалавечая супольнасць, але чалавечы элемент ў ёй няпросты: з аднаго боку, з'яўлена паўната таго, чым павінен і можа быць чалавек, з іншага — непаўната таго, чым ён ёсць у дадзены час. І тут можна сказаць словамі айца Георгія Флороўскага, аднога з са-

мых вялікіх багасловаў нашага часу, што Царква ўжо і дома, ды яшчэ ў дарозе, in patria et in via. Яна дома ў тым сэнсе, што немажліва нічога дадаць да таго, што ўяўляе сабою Царква; аднак кожны з нас павінен сябе перарасці ласкай Святога Духа і цягам усяго свайго жыцця ўваходзіць усё глыбей і глыбей у паўнату царкоўную.

І вось гэта не можа адбывацца выключна чалавечай — нават самай добрай — воляй. Мы можам прагнуць Бога, нудзіцца па Ім, можам рабіць усё, што мы можам, дзеля таго, каб вырвацца з нашага грахоўнага стану і прарвацца да Бога, але мы гэтага здзейсніць да канца самі не можам. Гэтак жа сама і ў стасунках паміж людзьмі: можна любіць чалавека ўсім сэрцам, усёй істотай, але калі не сустрэнеш узаемнай любові, то яднанне абаіх не можа здзейсніцца. Вядома, Бог нас любіць. Ён нас палюбіў нават раней, чым мы Яго спазналі, раней, чым мы сабе ўявілі, хто Ён такі і які Ён. Апостал Павел разважае пра тое, як цудна, як неймаверна і звыш нашага разумення тое, што Хрыстос Сваё жыццё мог аддаць за нас, калі мы былі яшчэ ворагамі Богу. Ён гаворыць, што і за сябра свайго мала хто сваё жыццё пакладзе, а за ворагаў?.. А Хрыстос нас так менавіта палюбіў, Бог у Хрысце такую любоў праявіў да нас. І мы можам ірвацца да Бога, звяртацца да Яго ўсёй сваёй істотай, не баючыся таго, што Ён нас не прыме.

Але ажыццявіць тую паўнату, пра якую мы марым, — гэта значыць быць не толькі тымі людзьмі, якімі б мы былі, калі б не падзенне, калі б мы засталіся першабытным, нявінным чалавецтвам, — гэта значыць стаць святым чалавецтвам. Розніца

ў тым, што чалавек быў створаны свабодным, гэта значыць, мог вызначыць свой лёс з Богам, без Яго ці супроць Яго. Тады чалавек быў нявінным у тым сэнсе, што ў ім не было граху. Грэх з'явіўся ў момант, калі чалавек адвярнуўся ад Бога дзеля таго, каб спазнаць сябе і свет уласнымі, творнымі сіламі. Гэта тое, што мы называем першародным грахом: першае адпадзенне ад Бога, якое пазбавіла чалавека мажлівасці расці роўна і ўрастаць у таямніцу Боства.

І вось для таго, каб мы маглі здзейсніць тое, да чаго былі пакліканы, Госпад устанавіў таемствы. Таемства — гэта Боскае дзеянне, якое нас прылучае да таго, што ёсць нашай прыродай: і творнай, і Боскай. Творнай — у тым сэнсе, што мы перасталі быць стварэннем, якім яго задумаў і стварыў Бог: нявінным, чыстым, адкрытым Богу да канца, без ценю. Аднак мы пакліканы і гэтую меру перарасці ў прылучэнні да Бога. І таму таемствы якімсьці цудоўным чынам выкарыстоўваюць рэчыва творнага свету для таго, каб нас прылучыць да таямніцы Боства. І на гэтым варта на імгненне засяродзіць увагу.

Якім чынам творнае рэчыва можа нас прылучыць да таго, чаго мы самі дасягнуць не здольныя? Рэч у тым, што стварэнне заняволенае грахом, дакладней, заняволенае недасканаласцю праз чалавечы грэх, але стварэнне як такое застаецца бязгрэшным, то і Бог можа ўсё творнае асвяціць паўнатой Сваёй прысутнасці і ласкі і праз стварэнне перадаць нам гэты дар ласкі і Богаприсутнасці. Калі Бог стаў чалавекам, Ён прылучыўся да ўсяго рэчыва сусвету; рэчыва сусвету магло Яго прыняць, — яно Богу ніколі не здраджвала, ніколі не паўставала су-

праць Бога. І вось у таемствах Госпад Ісус Хрыстос бярэ, скажам, хлеб і віно, пры хросце бярэ ваду, пры мірапамазанні ялей і г. д., і гэтае рэчыва злучае з Сабой так, каб тое рэчыва, якое Ён перадае, аддае нам, магло нас асвяціць. У водах Хросту, сілаю асвечаных водаў, мы ачышчаемся ад нашага граху. У дары Святых Таямніцаў мы прылучаемся да Цела і Крыві Хрыста, таму што хлеб і віно могуць прылучыцца да Бога непасрэдна, дарам Божым, тады як мы самі, проста воляй ці няволяй, не можам больш гэтага зрабіць.

Дзейца ўсякага таемства — Сам Госпад Ісус Хрыстос і Дух Святы. Чалавек ніякімі сваімі сіламі, нават пры рукаўскладанні на святарства, нават пры пастаўленні ў епіскапства, не атрымлівае ўлады над створаным светам, не можа проста ўзяць хлеб зямлі і зрабіць яго часткай Цела Хрыстовага або ўзяць кубак віна і зрабіць часткай Крыві Хрыстовай. Гэта можа здзейсніць толькі Сам Госпад Ісус Хрыстос. І ў гэтым сэнсе адзіны Тайнадзейца — Бог.

Але калі ставіцца пытанне: у чым роля святара? Ці патрэбны ён для чаго-небудзь? Так, ён патрэбны, таму што для таго, каб здзейсніўся цуд, неабходна супраца чалавека, неабходна ягоная добрая воля, неабходна ягоная вера, неабходна ягоная адкрытасць, неабходны ягоны дар самога сябе. І святар — чалавек, якога Бог ставіць на той мяжы, на якой можа стаяць толькі Сам Госпад Ісус Хрыстос. Гэта адно з самых узрушальных перажыванняў у жыцці, калі чалавек, якога пастаўляюць у дыяканы, пераходзіць мяжу царскае брамы. Да гэтага ён уваходзіў у алтар бакавымі дзвярыма, цяпер ён

уваходзіць праз царскую браму, праз якую толькі Цар Славы можа ўвайсці паводле годнасці і права. У гэты момант я заўжды спыняю пастаўлянага і яму кажу: «Ты разумееш, што зараз адбудзецца? Ты зараз пройдзеш праз мяжу, якую толькі Хрыстос мае права перайсці, і ты можаш перайсці гэтую мяжу, толькі калі ты так злучаны з Хрыстом, што Ягоная смерць, Ягоная мёртвасць у дачыненні да граху становіцца тваёй, і Ягонае жыццё таксама становіцца тваім».

І ў таемствах дыякан будзе ўдзельнічаць, удзельнічае, як ікона, як вобраз. Ён — голас Божы і адначасна — голас народу. Ён голас народу ў тым сэнсе, што ён крычыць ад імя ўсяго стварэння, усяго прысутнага народу: «Госпадзе, прыйдзі! Госпадзе, здзейсні над намі неспасціжнае таемства, злучы нас з Сабою! Ачысці нас ад граху, прылучы нас да Тваёй святасці!» І ў адказ на гэта Дух Святы сыходзіць на воды Хросту, на хлеб і віно Прычасця, на ялей Мірапамазання. Пра гэта мы павінны памятаць. Кожны святар павінен памятаць, што ён стаіць у імя ўсяго народу, з'яўляецца як бы часткай гэтага народу, які патрабуе збаўлення, і ён стаіць, вымаўляючы словы, якія толькі Хрыстос можа вымавіць, якія ён можа прамовіць над хлебам, над віном, над водамі Хросту і г. д. Такім чынам, таемствы — дзеянні сапраўднай чалавецкасці. У таемстве Хросту мы паступова становімся, пастаянна ўзрастаючы, тымі людзьмі, якімі пакліканы стаць, ачышчаемся ад граху, які нас аддзяляе ад Бога, робімся чыстымі, падобнымі да Адама і Евы, якімі яны былі створаны. Больш за тое: мы перарастаем гэтую меру прылучанасцю да

Хрыста, Які нас прылучае да Сваёй чалавецкасці, чалавецкасці дасканалай, і ў ёй прылучае нас і да Сваёй Боскасці.

Пэўна, варта спыніцца асобна і асабліва на таемстве Хросту. Таемства Хросту мы можам зразумець з падзеяў, якія апісаныя ў Евангеллі. Ёсць як бы тры моманты ў таемстве Хросту. Першы момант — хрост Янаў. Ян Хрысціцель клікаў да сябе народ і казаў: «Пакайцеся!» — гэта значыць адмоўцеся ад усяго грахоўнага, ад усяго бруду, ад усяе няпраўды, ад усяе сваёй заняволенасці злом; і каб паказаць сваю гатоўнасць да гэтага, акуніцеся ў ваду, як бы змыйце з сябе нечысціню. Адзін выбітны пастыр мне казаў, як ён разумее гэты хрост. Ён казаў, што, калі Хрыстос акунаецца ў гэтыя воды, Ён акунаецца ў воды, ацяжараныя ўсім грахом чалавецтва, ацяжараныя смяротнасцю, якую цягне за сабой грэх. І Ён, акунаючыся ў гэтыя воды, у сваю чаргу, акунаецца ў смяротнасць, не прымаючы на Сябе грэх, але прымаючы на Сябе ўсе наступствы граху. Гэты святар даў прыклад, які мяне вельмі ўразіў. Гэтае акунанне (гаварыў ён) падобнае да таго, як можна чысты лён акунуць у фарбу: лён, вядома, не мяняецца па сутнасці, але мы яго вымаем пафарбаваным. Вось што здзяйсняецца ў Хросце Хрыстовым. Ён непазбежна звязаны з хростам Янавым, хростам пакаяння людзей, які гэтыя воды як бы напаўняе смяротнасцю людской. Хрыстос прымае на Сябе гэтыя воды як смерць усяго чалавецтва, якую Ён панясе да Крыжа.

І калі мы акунаемся ў воды Хросту, мы акунаемся ў воды, з якіх Хрыстос як бы выцягнуў усю смя-

ротнасць, усю нечысціню: воды гэтыя дакрануліся да чысціні, да святасці Самога Хрыста і цяпер перапоўнены агнём Боскасці, у іх Хрыстос спаліў смяротнасць, прыняўшы яе на Сябе. Калі мы прыходзім хрысціцца, мы павінны памятаць, што акунаемся ў воды, якія з'яўляюцца сімвалам смерці і ўваскрасення. Гэта вельмі проста сабе ўявіць: дзіцяці гэта зразумець прасцей, відаць, чым вучонаму чалавеку, які хоча бачыць сімвалы. Калі чалавека акунуць з галавой у ваду, гэта смерць для яго. І калі нас акунаюць з галавой у воды Хросту, мы павінны гэта адчуць як момант, калі смерць прыйшла да нас, калі толькі мы не будзем пакліканы з гэтай стыхіі смерці голасам Божым... І другое дзеянне: мы ўзыходзім, выходзім з гэтых водаў — гэта сімвал нашага ўваскрасення. Мы выходзім — і дыхаем па-новаму. Мы ачышчаны ад нашага першароднага граху адрачэння ад Бога, чужынства Яму, і выходзім у сферу новага жыцця. Мы робімся цяпер Хрыстовымі, мы на сабе як бы нясём чысціню, святасць Хрыста разам з Ягоным вечным жыццём, якое нам дадзена. Але — Божа мой! — што гэта значыць? Гэта значыць, як апостал Павел гаворыць, што раней, да Хросту, мы апаганьвалі толькі сябе саміх, а калі мы апаганьваем нашае цела і душу пасля Хросту, мы апаганьваем Самога Хрыста. Апостал вельмі трагічна гэта выражае, калі ўсклікае да вернікаў і кажа: няўжо мы возьмем члены цела Хрыстовага — гэта значыць, нашы члены, рукі, ногі, усё цела — і зробім іх членамі распусніцы? (гл. 1 Кар 6:15). І не абавязкова ў граху распусты, а ва ўсім тым, што з'яўляецца «распустай» у дачыненні да Бога: дзе-

яннем, думкамі, жаданнямі, учынкамі, якія ніяк не сумяшчальныя з нашым адзінствам з Хрыстом.

У гэтым трагічнае значэнне Хросту, ягонае гранічнае значэнне: мы робімся Целам Хрыста, і ўсё тое, што мы робім над сваім целам, над сваёй душой, над сваім жыццём, мы здзяйсняем, быццам богазабойцы або людзі, якія ўжо наноў адракаюцца ад Хрыста пасля таго, як сталі еднымі з Ім. Гэта вельмі вялікая адказнасць.

Але толькі пасля акунання ў гэтыя воды і прыняцця гэтай еднасці з Хрыстом, мы можам ісці далей — ад Хросту да дара Святога Духа, Які, вядома, нам даецца безадкладна, таксама як Ён быў дадзены Хрысту, калі Ён выйшаў з водаў Ярданскіх; і далей ісці да царскае брамы, праз якую мы яшчэ не пройдзем, але з якой да нас выйдзе Хрыстос, прылучаючы нас да Цела і Крыві Сваіх. Вось у чым сутнасць усіх таемстваў.

Пра пакаянне

Звернемся цяпер да дваістай тэмы: пра пакаянне і пра споведзь. Споведзь, вядома ж, змяшчае ў сабе пакаянне, але каб зразумець, у чым сутнасць пакаяння, трэба гутарыць пра яго асобна. Пакаянне заключаецца ў тым, што чалавек, які дагэтуль адвярнуўся ад Бога ці жыў сабой, раптам ці паступова пачынае разумець, што ягонае жыццё не можа быць поўным у тым выглядзе, у якім ён яго пражывае. Пакаянне заключаецца ў тым, каб павярнуцца да Бога тварам. Гэты момант — толькі пачатковы, але рашучы, калі мы раптам змяняем курс і замест таго, каб стаяць спінай ці бокам да Бога, да праўды, да свайго паклікання, робім першы рух, — мы павярнуліся да Бога. Мы яшчэ не пакаяліся, у тым сэнсе, што яшчэ не змяніліся, але для таго, каб гэта адбылося, мы павінны штосьці перажыць: немагчыма адвярнуцца ад сябе і навярнуцца да Бога толькі таму, што нам так надумалася.

Бывае, чалавек жыве спакойна, нічога асаблівага з ім не адбываецца, ён быццам «пасвіцца» на полі жыцця, шчыпле траву, не думаючы ні пра бяздоннае неба над сабой, ні пра якую-небудзь там небяспеку; яму жыць добра. І раптам здарыцца нешта, што звяртае яго ўвагу на тое, што не ўсё так проста; раптам ён адкрывае: штосьці «не так». Якім чынам? Гэта бывае па-рознаму.

Часам чалавек здзяйсняе той ці іншы быццам нязначны ўчынак — і адразу бачыць яго наступствы. Памятаю аднаго хлапчука: ён размахваў кінжалам і закрануў вока маленькай сястры. Яна засталася сляпой на адно вока на ўсё жыццё; але брат ужо ніколі не забываў таго моманту, калі ён раптам зразумеў, што значыць бяздумна, безадказна гуляцца з такім прадметам як кінжал. Гэта не азначае, вядома, што ён баяўся дакрануцца да кінжала ці сцізорыка; але ён ведаў: самыя нязначныя дзеянні могуць набываць канчатковае, трагічнае значэнне.

Здараецца, што думка, якая вядзе нас да пакаяння, прыходзіць да нас не так трагічна: мы выпадкова чуем, што пра нас мяркуюць людзі. У нас заўсёды добрае ўяўленне пра саміх сябе, і калі нас крытыкуюць, мы часцей думаем, што той чалавек, які нас не бачыць такімі цудоўнымі, якімі мы сябе бачым, памыляецца. Але вось чуем меркаванне іншых людзей пра нас. Мы лічылі сябе героямі, а ўсе мяркуюць, што мы — баязліўцы. Мы лічылі сябе бездакорна праўдзівымі, а людзі мяркуюць, што мы — хлуслівыя, і г. д. Калі спыніць увагу на гэтым, то мы ўжо задаём сабе пытанне: чым я ёсць?... І ў гэты момант, калі мы задаём сабе гэтае пытанне, паўстае і наступнае: якое маё пакліканне ў жыцці?.. Я кажу не аб рамесніцкім прызванні, а — якім чалавекам я магу стаць? Няўжо я задаволены тым, чым з'яўляюся? Ці не магу я сябе як бы перарасці, стаць лепшым?..

Часам бывае, што не народная «слава», не меркаванне таго ці іншага нашага знаёмца звяртае нашу ўвагу на нас саміх, а, напрыклад, чытанне Евангелля. Я чытаю Евангелле і раптам бачу, якім можа быць ча-

лавек; я бачу вобраз Хрыста ва ўсім ягоным харастве, ці, прынамсі, у той меры, якую я здольны ўспрыняць, і я пачынаю сябе параўноўваць. Вось калі я пачынаю звяртаць увагу не на сябе самога, а ці то на вобраз Хрыста, ці то на тое, як пра мяне мяркуюць людзі, — тады вось і пачынаецца суд нада мной. І ў той момант, калі пачынаецца суд, пачынаецца і пакаянне. Гэта яшчэ не паўната пакаяння, таму што здзейсніць якасны суд над сабой не азначае быць параненым у душу тым, што я ўчыніў ці чым я з'яўляюся. Часам галавой мы ўсведамляем, што мы дрэнныя ці што нам варта было б быць іншымі ў тым ці іншым сэнсе, але пачуццём мы гэтага не можам перажыць. Я дам вам прыклад.

У 1920-я гады ў Францыі быў з'езд Рускага Студэнцкага Хрысціянскага Руху. Там прысутнічаў цудоўны святар, айцец Аляксандр Ельчанінаў, чые творы некаторыя з вас, напэўна, чыталі, бо яны былі выдадзеныя не толькі за мяжой, але цяпер і ў Расіі. Да яго на споведзь прыйшоў афіцэр і сказаў: «Ведаеце, я вам магу выкласці ўсю няпраўду майго жыцця, але я яе толькі галавой усведамляю; маё сэрца застаецца абсалютна некранутым, мне ўсё роўна. Галавой я разумею, што гэта ўсё зло, а душой не адгукаюся ні болем, ні сорамам». І айцец Аляксандр зрабіў ашаламляльную рэч; ён сказаў: «Не спавядайцеся ў мяне, гэта будзе абсалютна дарэмна. Заўтра, перад тым, як я буду служыць літургію, вы выйдзеце наперад і, калі ўсе збяруцца, паўторыце тое, што толькі што сказалі мне, і прынясіце споведзь перад усімі, хто там будзе». Афіцэр пагадзіўся, бо адчуваў, што ён — мярцвяк, што ў ім жыцця няма, што ў яго толькі памяць

ды галава, але сэрца мёртвае і жыццё ў ім згасла. І ён выйшаў з пачуццём жудасці: вось, я зараз пачну распавядаць, і ўвесь з'езд ад мяне адвернецца. Усе з жахам паглядзяць на мяне з думкай: нам здавалася, што ён прыстойны чалавек, а ён не толькі паскудзь, але і перад Богам — мярцвяк… Ён стаў, пераадолеў свой страх і жудасць і пачаў казаць. І здарылася штосьці для яго зусім нечаканае: у момант, калі ён сказаў, дзеля чаго ён устаў перад царскай брамай, увесь з'езд звярнуўся да яго са спачувальнай любоўю, ён адчуў, што ўсе яму адкрыліся, адкрылі абдымкі свайго сэрца, усе з жудасцю думаюць пра тое, як яму балюча і сорамна… І ён разрыдаўся, і ў слязах прамовіў сваю споведзь, і для яго пачалося новае жыццё.

Тут мы закранаем вельмі важны момант, менавіта — пакаянне. Пакаянне не заключаецца ў тым, каб бяздушна ўбачыць у сабе грэх і яго прынесці Богу на споведзі; пакаянне заключаецца ў тым, каб нас штосьці так ударыла ў душу, што з нашых вачэй і з нашага сэрца вырваліся слёзы. Святы Варсаноф Вялікі гаворыць, што слёзы сапраўднага пакаяння могуць нас так ачысціць, што ўжо непатрэбна ісці на споведзь, бо тое, што дараваў Бог, чалавеку не трэба ўжо даравадь. Ёсць і іншае месца ў вучня святога Сімяона Новага Багаслова, святога Мікіты Стыфата, дзе гаворыцца, што слёзы сапраўднага пакаяння могуць вярнуць чалавеку нават страчаную цялесную цнатлівасць… Пакаянне павінна быць менавіта такім.

Але мы не можам так каяцца пастаянна, гэта нам не па сілах. Што ж нам рабіць? Рабіць трэба вось што. Вы, напэўна, чыталі пра тое, як адбываюцца раскопкі

старажытных гарадоў ці помнікаў. Прыходзіць археолаг і пачынае скрэбці зямлю. Спачатку ён бачыць толькі звычайную глебу, але паступова ён пачынае адрозніваць пэўныя абрысы таго, што калісьці даўно легла пад зямлю. Гэта ўжо першае бачанне. Калі мы самым пачатковым чынам бачым у сабе штосьці нявартае нас саміх, ані той любові і павагі, якімі мы акружаныя, ані той любові, якую Бог да нас праяўляе, гэта ўжо пачатак нашага прасвятлення, і мы можам пайсці на споведзь і сказаць: «Я ведаю цяпер, што пад глебай, можа быць, вельмі глыбока, ляжыць свет граху, але штосьці пра яго я даведаўся ўжо на паверхні, я хачу гэта прынесці Богу і сказаць: я гэта ўбачыў. Ты мне дапамог гэта ўбачыць, Госпадзе, і я выракаюся гэтага зла. Я пакуль яшчэ не ўмею каяцца, але ўмею ведаць, што гэта несумяшчальна ні з маім сяброўствам з Табой, ні з тымі стасункамі, якімі мяне акружаюць мае блізкія, ні з тым, чым я хачу быць...» Існуе сярэднявечная адпушчальная малітва, якая сканчаецца словамі: «Няхай даруе табе Госпад усе грахі, у якіх ты сапраўды пакаяўся». Даруецца не проста тое, што ты распавёў на споведзі, а тое, перад чым душа твая здрыганулася, ад чаго ты жахнуўся. Астатняе з'яўляецца новай тваёй задачай. Ты павінен далей і далей, глыбей і глыбей сыходзіць у сябе, у гэтыя раскопкі і працягваць знаходзіць тое, што нявартае ні цябе, ні Бога, ні таго, што пра цябе мяркуюць людзі. Такім чынам, споведзь робіцца часткай пакаяння, якое паступова паглыбляецца, перад табой паступова раскрываюцца новыя глыбіні.

Але вы скажаце: «Няўжо жыццё заключаецца ў тым, каб сыходзіць у гэтыя глыбіні, бачыць у сабе

толькі зло, адное зло, пастаянна сыходзіць у цемру? З гэтым нельга жыць!» Не, з гэтым жыць нельга, але цемру рассейвае святло. Калі мы бачым у сабе штосьці цёмнае, то толькі таму, што святло пранікла ў новую глыбіню нашага жыцця. Вось прыклад, які я даю дзецям, але і дарослым часам не зашкодзіць пачуць дзіцячы прыклад. Калі дзеці кажуць: «Я ўглядаюся ва ўсё зло, што ўва мне ёсць, але не ўмею яго выкараняць, вырываць з сябе,» — я адказваю: «А скажы: калі ты ўваходзіш у цёмны пакой, няўжо для таго, каб у ім перастала быць цёмна, ты махаеш белым ручнікам са спадзяваннем, што цемра разыйдзецца, рассеецца?» — «Не, вядома, не!» — «А што ты робіш?» — «Я адчыняю аканіцы, адвешваю фіранкі, адчыняю акно». — «Вось! Ты праліваеш святло туды, дзе панавала цемра. гэтак жа сама і тут. Калі ты хочаш па-сапраўднаму каяцца, спавядацца па праўдзе і змяняцца, табе не трэба засяроджвацца толькі на тым, што ў табе дрэннае, табе трэба як бы ўпусціць у сябе святло. А дзеля гэтага трэба звярнуць увагу на тое, што ў цябе ўжо ёсць светлага, і ў імя гэтага святла змагацца са сваёй цемрай, якая ў табе ёсць». — «Так. Але як гэта зрабіць? Няўжо думаць пра сябе: вось, я такі добры ў тым, ці іншым сэнсе?» — «Не. Чытай Евангелле і адзначай у ім месцы, якія б'юць цябе ў душу, ад якіх трымціць сэрца, розум святлее, якія збяруць тваю волю для жадання новага жыцця. І ведай, што ў гэтым слове, у гэтым вобразе, у гэтай запаведзі, у гэтым прыкладзе Хрыста ты знайшоў іскрынку Боскага святла. У гэтым сэнсе апаганены, пацямнелы абраз, якім ты ёсць, прасвятлеў. Ты ўжо хоць крышку падобны да Хрыста, у табе ўжо крыху

пачынае праяўляцца вобраз Божы. А калі так, то памятай, што калі ты будзеш грашыць супраць гэтага, то ты будзеш апаганьваць святыню, якая ў табе ўжо ёсць, ужо жыве, ужо дзейнічае, ужо расце. Ты будзеш зацямняць у сабе вобраз Божы, гасіць святло ці акружаць яго цемрай. Гэтага не рабі! І калі ты будзеш верны тым іскрам святла, якія ў табе ўжо ёсць, то пастутова цемра вакол цябе будзе рассейвацца. Па-першае, таму што там, дзе святло, цемра ўжо рассеяная, а па-другое, калі ты знайшоў у сабе нейкую вобласць святла, чысціні, праўды, калі ты раптам глядзіш на сябе і думаеш: у гэтым сэнсе, я насамрэч сапраўдны чалавек, не толькі поскудзь, якую я сабе ўяўляў, — тады ты можаш пачаць змагацца з тым, што наступае на цябе, як ворагі наступаюць на горад ці на войска, каб святло пацямнела ў табе. Ты, напрыклад, навучыўся шанаваць чысціню. І раптам у табе падымаецца брыдота думак, цялесных пажадаў, пачуццяў, пачуццёвасць. У гэты момант можаш сабе сказаць: я знайшоў у сабе іскрынку цнатлівасці, іскрынку чысціні, жаданне кагосьці палюбіць без таго, каб гэтага чалавека апаганіць нават думкай, не кажучы ўжо пра дотык; не, гэтыя думкі я ў сабе дапусціць не магу, не буду. Я буду змагацца супраць іх; і для гэтага звярнуся да Хрыста і буду крычаць да Яго: «Госпадзе, ачысці! Госпадзе, выратуй! Госпадзе, дапамажы!» — і Госпад дапаможа. Але Ён не дапаможа табе, раней як ты сам пазмагаешся.

Ёсць апавяданне ў жыцці святога Антонія Вялікага аб тым, як ён адчайна змагаўся са спакусай, змагаўся так, што, нарэшце, у знямозе ўпаў на зямлю і ляжаў без сілаў. І раптам перад ім з'явіўся

Хрыстос. Не маючы нават сілы падняцца, Антоній кажа: «Госпадзе, дзе ж ты быў, калі я так адчайна змагаўся?» І Хрыстос яму адказаў: «Я стаяў нябачна каля цябе, гатовы ўступіць у бітву, калі б ты толькі здаўся. Але ты не здаўся — і перамог».

І вось я думаю, што кожны з нас можа навучыцца так каяцца і прыходзіць на споведзь штораз ўжо з новай пермогай і з новым бачаннем таго поля бітвы, якое перад намі раскрываецца ўсё шырэй і шырэй. І мы можам атрымаць адпушчэнне нашых грахоў ад Хрыста, адпушчэнне таго, што мы ўжо ў сабе пачалі перамагаць; і, акрамя таго, атрымаць Божую ласку і новую моц перамагаць тое, чаго мы яшчэ не перамаглі.

Пра споведзь

Гаворачы пра пакаянне, я толькі крануўся споведзі, але пытанне аб споведзі настолькі важнае, што я хачу спыніцца на ім больш падрабязна і глыбока.

Споведзь бывае дваістая. Бывае асабістая, прыватная споведзь, калі чалавек падыходзіць да святара і адкрывае ў ягонай прысутнасці сваю душу Богу. І бывае агульная споведзь, калі людзі сыходзяцца вялікай або малой групай, і святар прамаўляе споведзь за ўсіх, у тым ліку і за сябе самога. Я хачу спыніцца спачатку на прыватнай споведзі і звярнуць вашу ўвагу вось на што.

Чалавек спавядаецца — Богу. У павучанні, якое святар прамаўляе перад споведдзю асобнага чалавека, гаворыцца: «Вось, дзіця, Хрыстос нябачна стаіць, прымаючы спавяданне тваё; я ж — толькі сведка». Гэта трэба памятаць: мы спавядаемся не святару, і не ён — наш суддзя. Я б сказаў болей: нават Хрыстос у гэты момант — не наш Суддзя, а наш Збавіцель, Які спачувае нам, пакутуе разам з намі. Гэта вельмі, вельмі важна, бо калі мы прыходзім на споведзь, мы знаходзімся ў прысутнасці сведкі. Але што гэта за сведка, якая ў яго роля?

Сведкі бываюць розныя. Напрыклад, адбылася аварыя на дарозе. Нейкі чалавек стаяў каля дарогі і бачыў, што здарылася; яго пытаюцца, што адбылося. Яму абсалютна ўсё роўна, хто правы, хто

вінаваты, ён проста кажа: я бачыў тое і тое... Ёсць іншы кшталт сведак — на судзе: адзін сведчыць супраць падсуднага, другі — на ягоную карысць. Гэта зусім іншае становішча, і гэтаму часткова адпавядае святар, бо ён стаіць перад Хрыстом і кажа: «Госпадзе, ён да Цябе прыйшоў у пакаянні, — прымі яго! Калі ўжо мне яго шкада, то Табе яго шкада нашмат больш за мяне. Я яго выратаваць не магу, я магу з ім чымсьці падзяліцца, чым-небудзь дапамагчы, але Ты можаш яго перамяніць».

А ёсць трэці кшталт сведкі. Калі заключаецца шлюб, запрашаюць самага блізкага чалавека. Ён — той, хто ў Евангеллі названы «сябрам жаніха» (у нашай практыцы можна было б сказаць таксама «сябар нявесты»). Гэта самы блізкі для жаніха і нявесты чалавек, які можа найбольш поўна раздзяліць з імі радасць перамяняльнай сустрэчы, з'яднаўчага цуду.

І вось святар займае гэтае месца: ён — сябар Жаніха, сябар Хрыста, ён чалавека, што каецца, прыводзіць да Жаніха-Хрыста. Ён так глыбока звязаны любоўю са спаведнікам, што гатовы з ім раздзяліць трагедыю і прывесці яго да збаўлення. І калі я кажу «раздзяліць ягоную трагедыю», то кажу пра штосьці вельмі, вельмі сур'ёзнае. Мне прыгадваецца адзін падзвіжнік, якога неяк спыталі: «Якім чынам кожны чалавек, што прыходзіць да цябе і распавядае пра сваё жыццё-быццё, нават без пачуцця пакаяння ці жалю, раптам бывае апанаваны жахам праз тое, наколькі ён грэшны, і пачынае каяцца, спавядацца, плакаць — і мяняцца?» І гэты падзвіжнік даў выдатны адказ. Ён сказаў: «калі чалавек прыходзіць да мяне са сваім грахом, то я гэты

грэх успрымаю як свой. Мы з гэтым чалавекам едныя; тыя грахі, якія ён зрабіў дзеяннем, я абавязкова зрабіў думкай, ці жаданнем, ці памкненнем. Таму я перажываю ягоную споведзь як сваю асабістую, я (як ён казаў) прыступка за прыступкай зыходжу ў глыбіні ягонага змроку, і калі я дайшоў да самай глыбіні, я ягоную душу звязваю са сваёй душой і каюся ўсёй моцай маёй душы ў грахах, якія ён спавядае і якія я прызнаю за свае. І тады ён — ахоплены маім пакаяннем і не можа не каяцца, і выходзіць вызваленым; а я наноў каюся ў сваіх грахах, бо я з ім едны спачуваннем і любоўю».

Гэта скрайні прыклад таго, як святар можа падыйсці да пакаяння іншага чалавека, як ён можа быць сябрам Жаніха, як ён можа быць тым, хто прыводзіць чалавека, што каецца, да збаўлення. Але для гэтага святар павінен навучыцца спачуванню, павінен навучыцца адчуваць і ўсведамляць сябе едным са спаведнікам. А прамаўляючы словы адпушчальнай малітвы, святар перад імі альбо кажа настаўленне, альбо не кажа. І гэта таксама патрабуе шчырасці і ўвагі. Часам бывае, што святар слухае споведзь, і раптам яму яўна, быццам праз Бога, праз Духа Святога адкрываецца, што ён мусіць сказаць спаведніку. Можа, яму падасца, што гэта недарэчы, але ён мусіць слухацца гэтага голасу Божага і вымавіць гэтыя словы, сказаць тое, што яму Бог паклаў на душу, на сэрца і ў розум. І калі ён так зробіць, тады, нават калі гэта не будзе датычыцца споведзі, якую прынёс чалавек, што каецца, ён гаворыць тое, што патрэбна гэтаму чалавеку.

Часам у святара няма пачуцця, што гэтыя словы ад Бога. (Ведаеце, і ў апостала Паўла ў пасланнях сустракаюцца словы, дзе ён піша: «Гэта я вам кажу імем Божым, імем Хрыстовым…», альбо «Гэта я вам кажу ад сябе…»). Але гэта не значыць, што словы святара — «адсябеціна»; гэта тое, што ён спазнаў з асабістага досведу, і ён дзеліцца гэтым досведам, — досведам грахоўнасці, досведам пакаяння і таго, чаму яго навучылі іншыя людзі, больш чыстыя і больш годныя за яго.

А часам і гэтага няма. Тады можна сказаць: «Вось што я прачытаў у святых айцоў, прачытаў у Святым Пісанні. Я магу табе гэта прапанаваць, ты гэта вазьмі пад увагу, задумайся, і, можа быць, праз гэтыя словы Боскага Пісання табе Бог скажа тое, што я не магу сказаць».

Калі-некалі праўдзівы святар мусіць сказаць: «Я ўсёй душой хварэў з табой падчас тваёй споведзі, але сказаць табе на яе нічога не магу. Я буду маліцца за цябе, але парады даць не магу». І ў нас ёсць прыклад гэтага. У жыцці прападобнага Амвросія Вопцінскага апісваюцца два выпадкі, як да яго прыходзілі людзі, адкрывалі сваю душу, сваю патрэбу, і ён тры дні трымаў іх без адказу. І калі, нарэшце, у яго настойліва пыталіся адказу, ён сказаў: «Што я магу адказаць? Вось ужо тры дні я малю Божую Маці мяне прасвятліць і даць адказ, — Яна маўчыць; як жа я магу казаць без Яе ласкі?»

Вось тое, што я хацеў сказаць пра прыватную, асабістую споведзь. Чалавек павінен прыйсці і сваю душу адкрываць. Не паўтараць чужых словаў, гледзячы ў кніжку, а паставіць перад сабою пытанне: калі

б я стаў зараз перад абліччам Хрыста Збаўцы і ўсіх людзей, якія мяне ведаюць, што стала б для мяне прадметам майго сораму? Што я не гатовы адкрыць перад усімі, бо было б вельмі страшна, што мяне ўбачылі такім, якім я сябе бачу?.. Вось у чым трэба спавядацца. Пастаў сабе пытанне: калі мая жонка, мае дзеці, мой самы блізкі сябар, мае супрацоўнікі ведалі б пра мяне тое ці іншае, было б мне сорамна ці не? Калі сорамна — спавядай. Калі тое ці іншае сорамна адкрыць Богу (Які і без таго гэта ведае, але ад Якога я стараюся гэта схаваць) ці было б страшна — адкрый гэта Богу. Бо ў той момант, калі ты гэта адкрыеш, усё тое, што прыносіцца ў святло, стаецца святлом. І тады ты можаш спавядацца і прамаўляць сваю споведзь, а не трафарэтную, чужую, пустую, бессэнсоўную споведзь.

Калі гаворка ідзе пра дзяцей, трэба памятаць, што дзецям нельга навязваць споведзі, якая не з'яўляецца іх уласнай споведдзю. Нельга ім казаць: «Ты запомні, што ты мяне раззлаваў вось тым, што ты зрабіў нядобра, вось пакайся ў гэтым». Трэба даць дзіцяці волю стаць перад Богам як перад сябрам, і з Ім падзяліцца ўсёй сваёй душой і жыццём, — нават сваім болем за бацькоў, нават тым, як ён часам цяжка перажывае іх.

А цяпер я хачу крыху сказаць пра агульную споведзь. Агульная споведзь можа прамаўляцца па-рознаму. Звычайна яна прамаўляецца так: збіраецца народ, святар кажа якую-небудзь уступную казань і затым па кнізе чытае пералік як мага большай колькасці тых грахоў, якіх ён чакае ад прысутных. Гэты пералік можа быць фармальным. Колькі

разоў я чуў: «Я не прачытваў ранішніх і вячэрніх малітваў», «я не прачытваў канонаў», «я не трымаў пастоў», я не рабіў таго, іншага… Гэта ўсё фармальна. Так, гэта не фармальна ў тым сэнсе, што гэта рэальныя грахі нейкіх людзей, можа, нават самога святара, але гэта не абавязкова рэальныя грахі гэтых людзей; рэальныя грахі бываюць іншыя.

Я вам распавяду, як праводжу агульную споведзь сам. Агульная споведзь у нас бывае чатыры разы на год. Перад споведдзю я праводжу дзве гутаркі, якія скіраваныя на разуменне таго, што такое споведзь, што такое грэх, што такое Божая праўда, што такое жыццё ў Хрысце. Кожная гутарка цягнецца сорак пяць хвілін, усе прысутныя сядзяць, слухаюць, затым надыходзіць паўгадзіннае маўчанне, напрацягу якога кожны павінен прадумаць тое, што пачуў, паглядзець на сваю душу і прадумаць сваю грахоўнасць. А потым бывае супольная споведзь. Мы збіраемся ў цэнтры храма, я надзяваю епітрахіль, перад намі Евангелле, і звычайна я чытаю Пакаяльны канон Госпаду Ісусу Хрысту. І пад уплывам канону прамаўляю ўголас уласную споведзь — не пра фармальнасці, а пра тое, за што мяне папракае маё сумленне і што адкрывае мне канон, які я чытаю. Кожная споведзь бывае розная, бо кожны раз словы гэтага канону выкрываюць мяне па-іншаму, у іншым, і я каюся перад усімі людзьмі, называю рэчы сваімі імёнамі, сваёй назвай. Не так, каб мяне потым хадзілі і папракалі канкрэтна за той ці іншы грэх, а так, каб кожны грэх быў раскрыты перад людзьмі як мой асабісты. І калі, прамаўляючы споведзь, я не адчуваю, што сапраўды

каюся, я прамаўляю і гэта ў якасці споведзі: «Прабач мне, Госпадзе! Вось, я прамовіў гэтыя словы, але яны да маёй душы не дайшлі»... Гэтая споведзь цягнецца зазвычай хвілін трыццаць-сорак, залежна ад таго, што я магу паспавядаць перад людзьмі. І адначасова людзі спавядаюцца — моўчкі, а часам і ўголас прамаўляючы: «Так, Госпадзе! Прабач мне! І я вінаваты ў гэтым!» Але гэта з'яўляецца маёй асабістай споведдзю. І, на жаль, я настолькі грахоўны і настолькі падобны да кожнага, хто прысутнічае на гэтай дзеі, што мае словы раскрываюць перад людзьмі іх асабістую грахоўнасць.

Пасля гэтага мы молімся. Мы чытаем частку пакаяльнага канона, чытаем малітвы перад Святым Прычасцем (не ўсе, а выбраныя, якія датычацца таго, пра што я казаў ці як спавядаўся). Затым усе становяцца на калені, і я прамаўляю адпушчальную малітву ўсім. Калі хтосьці лічыць патрэбным потым падыйсці і асобна сказаць пра той ці іншы грэх, ён свабодна можа гэта зрабіць. Але я з досведу ведаю, што такая супольная споведзь навучае людзей прыносіць індывідуальную споведзь. Многія мне казалі спачатку: «Я не ведаю, з чым прыйсці на споведзь. Я ведаю, што зграшыў супраць многіх запаведзяў Хрыстовых, нарабіў шмат благога, але я не магу гэта як бы сабраць у пакаяльную споведзь». А пасля гэткай супольнай споведзі людзі прыходзяць і кажуць: «Я цяпер ведаю, я навучыўся, як спавядаць уласную душу, абапіраючыся на малітвы Царквы, абапіраючыся на пакаяльны канон, абапіраючыся на тое, як Вы самі спавядалі сваю душу і як людзі вакол мяне тую самую споведзь

успрымалі і прыносілі, быццам сваю ўласную. Я думаю, што гэта вельмі важны момант: каб агульная споведзь была ўрокам таго, як спавядацца асабіста, а не «агулам».

Часам людзі прыходзяць і прачытваюць доўгі спіс грахоў — я гэты спіс ведаю, бо ў мяне ёсць тыя ж кніжкі, што ў іх. Я іх спыняю, кажу: «Ты не свае грахі спавядаеш, ты спавядаеш грахі, якія можна знайсці ў намаканоне, у малітоўніках. Мне патрэбна твая споведзь, дакладней, Хрысту патрэбна тваё асабістае пакаянне, а не агульнае трафарэтнае пакаянне. Ты не можаш адчуваць, што асуджаны Богам на вечную пакуту, бо не вычытваў вячэрніх малітваў ці не чытаў каноны, ці не так посціў».

Больш за тое: часам бывае, што чалавек і стараецца, напрыклад, посціць, а потым зрываецца і адчувае, што апаганіў увесь свой пост, што ад ягонага подзвігу нічога не застаецца. А насамрэч, Бог зусім інакш на гэта глядзіць. Гэта я магу вам патлумачыць адным прыкладам са свайго жыцця. Калі я быў лекарам, я займаўся адной рускай сям'ёй. Грошай я з іх не браў, бо ў іх аніякіх грошай не было. Але неяк напрыканцы Вялікага посту, цягам якога я посціў, калі можна так сказаць «па-зверску», не парушаючы ніякіх статутных правілаў, яны мяне запрасілі на абед, і высветлілася, што яны напрацягу пэўнага часу ў сваёй адсутнасці грошай збіралі капейчыну, каб набыць маленькага цыплюка і мяне пачаставаць. Я на гэтага цыплюка паглядзеў і ўбачыў у ім канец свайго поставага подзвігу. Вядома, я з'еў кавалачак цыплюка, — я не мог іх абразіць адмовай; але потым пайшоў да свайго духаўніка і кажу: «Ведаеце,

ойча Афанасіе, са мной такое гора здарылася! Цягам усяго посту, я, можна сказаць, пасціў дасканала, але цяпер, на Пакутным тыдні, з'еў кавалак курыцы». Айцец Афанасій на мяне зірнуў і кажа: «Ведаеш, калі Бог паглядзеў бы на цябе і ўбачыў, што ў цябе няма ніякіх грахоў, а кавалачак курыцы можа цябе апаганіць, Ён бы цябе ад гэтага абараніў; але Ён паглядзеў і ўбачыў у табе столькі грахоўнасці, што ніякая курыца цябе апаганіць не можа». Я думаю, многія з нас могуць запомніць гэты прыклад для таго, каб быць праўдзівымі, шчырымі людзьмі, а не проста трымацца статуту. Так, я з'еў кавалачак гэтай курыцы, але пытанне было ў тым, што я з'еў яго дзеля таго, каб не засмуціць людзей. Я з'еў яе не як нейкую погань, а як дар чалавечай любові. Ёсць месца ў творах айца Аляксандра Шмемана, дзе ён кажа: усё на свеце — гэта Божая любоў; і нават ежа, якую мы ямо, ёсць Божай любоўю, што стала ядомай…

Духоўнасць і духоўніцтва

Тэма майго дакладу — духоўнасць і духоўніцтва ці, калі хочаце, духоўнае стырнаванне ці душпастырства.

Я хацеў бы спачатку вызначыць слова «духоўнасць», таму што звычайна, калі мы гаворым пра духоўнасць, мы гаворым пра пэўныя выражэнні нашага духоўнага жыцця, такія, як малітва, як падзвіжніцтва; і гэта зразумела з такіх кніг, як, напрыклад, кнігі Феафана Затворніка. Мне здаецца, трэба памятаць — духоўнасць заключаецца ў тым, што ў нас чыніць дзеянне Святога Духа, і духоўнасць — гэта не тое, што мы ёю звычайна называем, а менавіта гэтыя праявы таемнага дзеяння Духа Святога.

І гэта адразу нас ставіць ў дачыненні да духоўніцтва ў вельмі выразную пазіцыю, таму што тады гаворка не пра тое, каб чалавека выхоўваць паводле нейкіх прынцыпаў і навучыць яго развівацца ў малітве ці аскетычна паводле нейкіх трафарэтаў. Духоўніцтва тады будзе заключацца ў тым, каб духоўнік, на якой бы ступені духоўнасці ён сам не знаходзіўся, пільна сачыў за тым, што над чалавекам і ў чалавеку здзяйсняе Святы Дух, усцепліваў бы Ягонае дзеянне, абараняў бы супраць спакусаў і падзенняў, супраць хістанняў няверʼя; і ў выніку духоўніцкая дзейнасць можа ўявіцца, з аднога боку, нашмат менш актыўнай, а з іншага боку — нашмат больш значнай, чым нам часта падаецца.

Перш, чым рухацца далей, я хачу сказаць колькі словаў пра тое, што духоўніцтва — не адназначнае паняцце. Ёсць, як мне падаецца, тры тыпы духоўнікаў.

На самым асноўным узроўні, гэта святар, якому дадзеная ласка святарства, які ў сабе носіць не толькі права, але і харызматычную сілу здзяйсняць таемствы — таемства Еўхарыстыі, таемства Хросту, таемства Мірапамазання, але таксама і таемства Споведзі, гэта значыць прымірэння чалавека з Богам. Вялікая небяспека, у якую трапляе малады недасведчаны святар, поўны энтузіязму і надзеі, заключаецца ў тым, што часам маладыя людзі, якія выходзяць з багаслоўскіх школаў, задаюцца, быццам хіратонія надала ім і розуму, і дасведчанасці, і «разрознення духаў», і робяцца тымі, каго ў аскетычнай літаратуры называлі «младастарцамі»; гэта значыць, не валодаючы яшчэ духоўнай сталасцю, не валодаючы яшчэ нават тымі ведамі, якія дае проста асабісты досвед, яны мяркуюць, што іх навучылі ўсяму, што можа ім дапамагчы ўзяць грэшніка ў пакаянні за руку і павесці ад зямлі на неба.

І, на жаль, гэта здараецца зачаста і ва ўсіх краінах: малады святар, толькі праз сваё святарства, але не таму, што ён духоўна дасведчаны, і не таму, што Бог яго да гэтага прывёў, пачынае кіраваць сваімі духоўнымі дзецьмі «наказамі»: гэтага ты не рабі; гэта ты рабі; такой літаратуры не чытай; у царкву хадзі, адбівай паклоны... І ў выніку ў ягоных ахвяраў атрымліваецца нейкая карыкатура на духоўнае жыццё, яны робяць усё, што, бадай, і рабілі падзвіжнікі, — але ж тыя рабілі гэта з духоўнага до-

сведу, а не таму, што яны намуштраваныя жывёлы. А для духоўніка — катастрофа, бо ён гвалтам урываецца ў такую сферу, у якую ў яго няма ні права, ні досведу ўрывацца. Я настойваю на гэтым, бо гэта надзённае пытанне для святароў.

Старцам можна быць толькі з ласкі Божай, гэта харызматычная з'ява, гэта дар; і навучыцца быць старцам нельга, гэтак жа, як нельга выбраць сваім шляхам геніяльнасць. Мы ўсе можам марыць пра тое, каб быць геніяльнымі, але мы выдатна разумеем, што Бетховен ці Моцарт, Леанарда да Вінчы ці Рублёў валодалі такой геніяльнасцю, якой нельга навучыцца ні ў якой школе, і нават нельга навучыцца даўгачасным досведам, але якая ёсць Боскім дарам ласкі.

Я настойваю на гэтым, можа быць, занадта доўга, бо мне здаецца, што гэтая тэма ў Расіі істотная, бадай, болей, чым на Захадзе, бо роля святара ў Расіі нашмат больш цэнтральная. І часта маладыя святары — маладыя ці паводле ўзросту, ці паводле сваёй духоўнай сталасці або няспеласці — «кіруюць» сваімі духоўнымі дзецьмі замест таго, каб іх узрошчваць.

Узрошчваць — гэта значыць ставіцца да іх і абыходзіцца з імі так, як садоўнік ставіцца да кветак ці да раслінаў: трэба ведаць прыроду глебы, трэба ведаць прыроду расліны, трэба ведаць умовы, у якія яны пастаўленыя, кліматычныя ці іншыя, і толькі тады можна дапамагчы — і гэта ўсё, што можна зрабіць — дапамагчы гэтай расліне развіцца так, як ёй уласціва, згодна з яе ўласнай прыродай. Ламаць чалавека дзеля таго, каб яго зрабіць падобным да сябе — нельга. Адзін духоўны пісьменнік Захаду сказаў: духоўнае

дзіця можна прывесці толькі да яго самога, і шлях унутр яго жыцця бывае часам вельмі доўгім... У жыціях святых можна пабачыць, як вялікія старцы гэта ўмелі рабіць, як яны ўмелі быць сабой, але духоўна ўбачыць у іншым чалавеку яго выключную, непаўторную ўласцівасць, і даць гэтаму чалавеку, і другому, і трэцяму мажлівасць быць таксама самімі сабой, а не рэплікамі гэтага старца ці, яшчэ горш, яго трафарэтным паўтарэннем.

Прыклад гэтаму ў гісторыі Рускае Царквы — сустрэча Антонія і Феадосія Пячэрскіх. Феадосій быў выхаваны Антоніем, ды, аднак, іх жыццё нічога агульнага не мае ў тым плане, што Антоній быў пустэльнікам, а Феадосій — пачынальнікам супольнага жыцця. Здавалася б — як мог яго Антоній падрыхтаваць рабіць тое, чаго сам ён не стаў бы рабіць, і выхаваць яго такім чалавекам, які ён сам не хацеў быць і да чаго Бог яго самога не паклікаў? Мне здаецца, тут трэба дужа яскрава адрозніваць нашае жаданне зрабіць чалавека падобным сабе і жаданне зрабіць яго падобным Хрысту.

Старацтва, як я сказаў, гэта харызматычны дар, гэта духоўная геніяльнасць, і таму ніхто з нас не можа думаць пра тое, каб паводзіцца падобна старцам. Але ёсць яшчэ і прамежкавая сфера — гэта айцоўства. І зноў-такі, занадта часта маладому — і не такому маладому — святару толькі таму, што яго называюць «айцец такі й такі», здаецца, што ён не проста спавядальны святар, а сапраўды «айцец», у тым сэнсе, у якім Павел гаворыць, што гадавальнікаў у вас шмат, але я нарадзіў вас у Хрыста; і тое самае ў свой час гаварыў святы Серафім Сароўскі. Айцоўства за-

ключаецца ў тым, што нейкі чалавек — і гэта можа быць нават не святар — нарадзіў да духоўнага жыцця іншага чалавека, які, зазірнуўшы ў яго, пабачыў, як старое прыслоўе гаворыць, у ягоных вачох і ў ягоным абліччы ззянне вечнага жыцця, і таму мог да яго падыйсці і прасіць быць сабе за настаўніка і кіраўніка.

Айца адрознівае таксама тое, што ён быццам аднок крыві, і ў духоўным жыцці — аднога духу са сваім вучнем, і можа яго весці, таму што паміж імі ёсць сапраўдная, не толькі духоўная, але і душэўная сугучнасць. Вы, пэўна, памятаеце, як у свой час егіпецкая пустыня была перанаселеная падзвіжнікамі і настаўнікамі, і, аднак, людзі не выбіралі сабе настаўніка паводле адзнакі яго выбітнай славы, не ішлі да таго чалавека, пра якога больш за ўсё казалі добрага, а знаходзілі такога настаўніка, якога яны разумелі і які разумеў іх.

І гэта дужа важна, таму што паслухмянасць не ў тым, каб навослеп рабіць тое, што гаворыць нехта, хто мае над вамі ці матэрыяльна-фізічную, ці духоўна-душэўную ўладу; паслухмянасць заключаецца ў тым, каб паслушнік, абраўшы сабе настаўніка, якому ён верыць безумоўна, у якім ён бачыць тое, чаго ён і сам шукае, услухоўваецца не толькі ў кожнае ягонае слова, але ўслухоўваецца і ў тон голасу, і стараецца праз усе праявы асобы настаўніка і ўсе праявы ягонага духоўнага досведу перарасці самога сябе, прылучыцца да гэтага ягонага досведу і стаць чалавекам, які ўжо вырас за мяжу той меры, якой ён даў бы рады дасягнуць сваімі ўласнымі высілкамі. Паслухмянасць — гэта найперш імкненне слухаць,

і чуць не толькі розумам, не толькі вухам, але ўсёй істотай, адкрытым сэрцам, сузіраннем з пашанай духоўнай таямніцы іншага чалавека.

А з боку духоўнага старца, які вас нарадзіў ці які вас успрыняў ужо народжанымі, але можа быць айцом для вас, мусіць быць глыбокая пашана да таго, што ў вас ажыццяўляе Святы Дух. Духоўны айцец — гэтак жа, уласна, як і любы добрасумленны прыходскі святар — мусіць быць у стане (і гэта часам даецца коштам высілкаў, удумлівасцю, стаўленнем з пашанаю да таго, хто да яго прыходзіць) бачыць у чалавеку тое хараство вобразу Божага, якое ніколі не адбіраецца; калі нават чалавек пашкоджаны грахом, духоўнік мусіць бачыць у ім ікону, якая пацярпела ад умоваў жыцця, ці ад чалавечай неахайнасці, ці ад блюзнерства; бачыць у ім ікону і трымцець перад тым, што засталося ад гэтай іконы, і дзеля гэтага боскага хараства, якое ў ім ёсць, працаваць над тым, каб прыбраць усё, што нявечыць ягоны вобраз Божы. Айцец Яўграф Кавалеўскі, калі яшчэ быў міранінам, неяк мне сказаў: калі Бог глядзіць на чалавека, Ён не бачыць у ім ані цнотаў, якіх можа і не быць, ані поспехаў, якіх ён не мае, але Ён бачыць непарушнае, зіхоткае хараство Уласнага Вобразу... І вось, калі духоўнік не здольны бачыць у чалавеку гэтае адвечнае хараство, бачыць у ім пачатак здзяйснення ягонага паклікання стаць паводле вобразу Хрыста богачалавекам, то ён не можа яго весці, таму што чалавека не будуюць, не робяць, а яму дапамагаюць вырасці ў меру ўласнага ягонага паклікання.

І тут слова «паслухмянасць», можа быць, варта трошкі ўдакладніць. Звычайна мы гаворым пра пас-

лухмянасць як пра падначаленасць, падуладнасць, а часам і заняволенне духоўнікам ці тым, каго мы назвалі духоўным айцом ці сваім старцам — зусім дарэмна і дзеля шкоды не толькі сабе, але і святару. Паслухмянасць жа заключаецца менавіта ў тым, пра што я сказаў вышэй: у слуханні ўсімі высілкамі душы. Але гэта абавязвае ў роўнай ступені і душпастыра, і паслушніка; таму што духоўнік мусіць прыслухоўвацца ўсім сваім досведам, усёй сваёй істотай і ўсёй сваёй малітвай, і скажу больш — усім дзеяннем у ім ласкі Святога Духа, да таго, што чыніць Дух Святы ў чалавеку, які яму даверыўся. Ён мусіць умець прасачыць шляхі Духа Святога ў ім, ён мусіць трымцець перад тым, што Бог чыніць, а не старацца выхаваць альбо паводле свайго ўзору, альбо паводле таго, як яму здаецца, чалавек мусіў бы развівацца як «ахвяра» ягонага духоўнага стырнавання.

І з абодвух бакоў гэта патрабуе зміранасці, пакоры. Чакаем мы лёгка пакоры з боку паслушніка ці духоўнага дзіцяці; ды колькі зміранасці патрэбна святару, духоўніку для таго, каб ніколі не ўрывацца ў святую сферу, каб ставіцца да душы чалавека так, як Майсею загадаў Бог паставіцца да глебы вакол неапальнай купіны. І кожны чалавек — патэнцыйна і рэальна — ужо ёсць гэтай купінай; і ўсё, што навокал яго, — гэта глеба святая, на якую духоўнік можа ступіць, толькі зняўшы свае боты, ніколі не ступіць інакш, чым мытнік, які стаіць на бабінцы храму, глядзіць у храм і ведае, што гэта сфера Бога Жывога, месца святое, і ён не мае права ўвайсці туды інакш, як толькі калі Сам Бог накажа ці Сам Бог падкажа, якую дзею ўчыніць ці якое слова сказаць.

Адна з задачаў духоўніка ў тым, каб выхаваць чалавека ў духоўнай свабодзе, у царскай свабодзе дзяцей Божых, і не трымаць яго ў стане інфантыльнасці ўсё жыццё: каб ён не прыбягаў заўжды па дробязях, пуста, дарэмна да свайго айца, а вырас у такую меру, калі ён сам навучыцца чуць тое, што Дух Святы прамаўляе невымоўнымі словамі ў ягонае сэрца.

І калі падумаць пра тое, што значыць зміранасць, можна звярнуцца да двух кароткіх вызначэнняў. Першае: «смирение» па-руску гэта стан прыміранасці, калі чалавек прымірыўся з воляй Божай, гэта значыць аддаўся ёй неабмежавана, цалкам, радасна, і гаворыць: «Рабі са мной, Госпадзе, што хочаш!» — але ў выніку прымірыўся і з усімі акалічнасцямі ўласнага жыцця: усё — дар Божы, і добрае, і страшнае. Бог нас паклікаў быць Ягонымі пасланцамі на зямлі, і Ён нас пасылае туды, дзе цемра, каб быць святлом; дзе безнадзейнасць — каб быць надзеяй; дзе радасць памерла — каб быць радасцю. І нашае месца не проста там, дзе спакойна, у храме, пры служэнні літургіі, калі мы абароненыя ўзаемнай прысутнасцю, а там, дзе мы стаім па адным, як прысутнасць Хрыстовая ў цемры знявечанага свету.

Калі падумаць потым пра лацінскія карані зміранасці, пакоры, то humilitas паходзіць ад слова humus, якое азначае «ўрадлівая глеба». Падумайце — пра гэта таксама піша Феафан Затворнік, — што ўяўляе сабою зямля: яна ляжыць, бязгучная, адкрытая, безабаронная, паражальная, перад аблічам неба; яна прымае ад неба і спёку, і промні сонца, і дождж, і расу, але яна прымае таксама і тое, што мы называем угнаеннем, — гэта значыць, гной,

выкіды, усё, што мы ў яе кідаем, — і што адбываецца? — яна прыносіць плён, і чым больш яна выносіць таго, што мы душэўна называем прыніжэннем, абразай, тым больш яна прыносіць плёну.

І вось зміранасць — гэта значыць раскрыцца перад Богам так дасканала, каб ніяк супраць Яго, супраць уздзеяння Святога Духа ці супраць станоўчага вобразу Хрыста, Яго вучэння не абараняцца і быць паражальным для ласкі, як у грахоўнасці нашай мы паражальныя бываем для рук людскіх, для вострага слова, для жорсткага ўчынку, для кпінаў, — і аддаць сябе так, каб з нашага ўласнага жадання Бог меў права здзейсніць з намі, што б Ён ні пажадаў: усё прымаць, адкрывацца, і тады даць проста Святому Духу скарыць нас.

Мне здаецца, што калі і духоўнік будзе вучыцца зміранасці ў гэтым сэнсе: бачыць у чалавеку спрадвечнае хараство, і ведаць сваё месца (а гэтае месца такое дзіўнае, такое святое: месца дружкі жаніха, для якога нявеста — не ягоная нявеста, але які пастаўлены наканаваць сустрэчу жаніха і нявесты), тады духоўнік можа сапраўды быць спадарожнікам свайго духоўнага дзіцяці, ісці крок за крокам з ім, аберагаючы яго, падтрымліваючы яго і ніколі не ўрываючыся ў сферу Святога Духа; і тады духоўніцтва стаецца часткай той духоўнасці і таго ўзрастання ў святасць, да якой кожны з нас пакліканы і якую кожны духоўнік мусіць дапамагчы сваім духоўным дзецям ажыццявіць.

Але дзе шукаць душпастыраў? Бяда ў тым, што старцаў, нават духоўнікоў, нельга шукаць, таму што мы можам абыйсці ўвесь свет і не знайсці; але досвед падказвае, што часам Бог нам пасылае патрэб-

нага чалавека ў патрэбную хвіліну хоць на кароткі тэрмін. І ён тады раптам робіцца для нас тым, чым старцы былі ў працяглым часе. Ведаеце, я часта думаю, што мой быццам нябесны апякун — варлаамава асліца, якая загаварыла і сказала праpоку тое, чаго ён сам бачыць не мог, у тым сэнсе, што так часта да мяне прыходзіць чалавек, і я не ведаю, што яму адказаць, і раптам нечакана скажу штосьці — і аказваецца слушна. І я думаю, што ў такі момант Бог табе дае слова; але разлічваць на тое, што твой досвед, твая начытанасць табе дасць магчымасць гэта заўжды рабіць, немагчыма, і таму даводзіцца вельмі часта з трымценнем прамаўчаць, а потым сказаць чалавеку: «Ведаеш, я зараз не магу табе адказаць...» І ў нас ёсць выдатны прыклад з жыцця Амвросія Вопцінскага; да яго прыходзілі людзі, просячы парады, ён іх прымушаў два-тры дні чакаць; у адным выпадку купец прыйшоў, кажа: «Мне трэба вяртацца, у мяне лаўка зачыненая, а ты мне адказу не даеш...» І Амвросій яму адказаў: «Не магу табе нічога сказаць! Я пытаўся адказу ў Божай Маці, і Яна маўчыць...» І я думаю, што і мы маглі б сказаць: «Я мог бы табе ад розуму, ад кніг, ад расповедаў штосьці сказаць, але гэта было нерэальна, — а вось я не магу табе нічога сказаць. Маліся, я буду маліцца, калі штосьці мне Бог на душу пакладзе, я табе напішу, я табе скажу». І чалавек ставіўся б тады да слова, якое ты скажаш, калі ты гаворыш яго, зусім інакш, чым калі на ўсе выпадкі жыцця ў цябе прапісныя ісціны, таму што ўсе напамяць ведаюць твае прапісныя ісціны: адзінае пытанне ў тым, што чалавек не ведае, якая яго датычыцца на сёння.

Цяпер я хачу патлумачыць, што калі я гаварыў пра геніяльнасць, я не казаў ні пра святарства, ні нават пра катэгорыю духоўнага айцоўства, а спецыяльна і выключна пра старацтва. І я ўжыў слова «геніяльнасць», таму што ў сферы размоўнай мовы яно выражае тое, што можна назваць харызматычнасцю. У сферы свецкай гэта геніяльнасць музычная, артыстычная, матэматычная — гэта нешта, чаго мы не можам дасягнуць ніякімі ўласнымі высілкамі. Таму я гаварыў не пра святарства наогул, і, вядома, не думаў бэсціць прыходскага святара, самага маладога, простага, але шчырага, які робіць сваю святарскую справу, спавядаючы людзей, дзелячыся з тым, чаму ён навучыўся ад айцоў Царквы, ад багасловаў, ад уласнага духоўніка, ад навакольнага хрысціянскага малітоўнага асяродка. Гэта каштоўная рэч. Але ёсць момант, які мяне крыху бянтэжыць: гэта тое, што некаторыя святары — і чым больш яны духоўна непісьменныя і нясталыя (гэта тычыцца таксама і міранаў, але цяпер я б'ю па святарах, таму што яны «прафесіяналы»), тым лягчэй яны думаюць, што як толькі яны апранутыя ў расу, надзелі епітрахіль, яны будуць гаварыць ад Бога. Я памятаю дужа шаноўнага чалавека, якога цяпер многія лічаць вялікім старцам на зямлі, які казаў: я больш не малюся, калі людзі ставяць мне пытанне, бо таму што пасля малітвы я гавару Святым Духам, дык калі яны не выканаюць дакладна тое, што я скажу, яны грашаць супраць Духа Святога, і ім няма даравання... Вось гэта я меў на ўвазе; гэта, вядома, дзякуй Богу, крайнасць. І я ў жаху, калі чалавек можа думаць, што праз тое, што ён тройчы сказаў: «Госпадзе, прасвятлі

мой розум, які азмрочыла аблудная пажада», то наступныя ягоныя словы будуць проста прароцтвам ад Бога.

Я думаю, што тут проста элементарная разважлівасць іграе ролю: можна казаць пра тое, што ты ведаеш пэўна. Скажам, беручы прыклад агромністага маштабу: святы апостал Павел мог гаварыць з абсалютнай пэўнасцю пра тое, што ўваскрэс Хрыстос, бо ён сустрэў жывога, уваскрэслага Хрыста на дарозе ў Дамаск; пра некаторыя іншыя рэчы ён казаў не з такога першаснага досведу. Іншыя людзі таксама валодаюць нейкім досведам, меншага маштабу, мажліва, меншай сілы, але пра які яны могуць гаварыць: «Так, я ведаю пэўна» — як адзін бязбожнік, што навярнуўся да Бога, напісаў у Францыі кнігу пад назовам «Бог існуе, і я Яго сустрэў».

Святар і міранін могуць таксама гаварыць з досведу царкоўнага, да якога яны прыналежныя, нават калі не валодаюць ім цалкам; бо, маючы агульныя з іншымі некаторыя перадумовы досведу, яны могуць прыслухоўвацца да досведу іншых, досведу, які яшчэ не стаў цалкам іх досведам, але калі гэта трэба іншаму, яны могуць сказаць: гэта — праўда, бо так гаворыць Царква, і я ведаю з нетраў царкоўных больш, чым я ведаю з уласнага досведу...

І, нарэшце, ёсць рэчы, пра якія мы можам гаварыць толькі таму, што іх нам адкрыў Госпад.

Пра малітву

Калі слушна тое, што я раней казаў пра Царкву: што яна ёсць месцам сустрэчы, больш за тое — месцам злучэння Бога з чалавекам і адначасова самім цудам гэтага злучэння, то справядліва сказаць, што ёсць тры элементы ў жыцці верніка і Царквы ў цэлым, якія абсалютна неабходныя. Першае — гэта, безумоўна, тое дзеянне Божае, якое нас з ім злучае. Я не гавару цяпер пра Уцялесненне, а менавіта пра таемствы, пра тыя дзеянні Гасподнія, якія здзяйсняюцца Ім — над намі, але не без нас, таму што ў таемствах з нашага боку патрабуецца шчырасць, вера, прага сустрэчы з Богам. З іншага боку, дары Божыя нам прапаноўваюцца, але мы павінны змагацца за тое, каб гэтыя дары не толькі сталі нашым набыткам, але працялі нас да самых глыбіняў. І таму калі мы хочам быць членамі Царквы, вучнямі Хрыста, сябрамі Хрыста, то ўваходзіць у сілу момант вернасці. А гэта азначае пастаянны подзвіг, пастаянную барацьбу з самім сабою, з грахом, з усімі сіламі зла, якія толькі трапляюцца нам у жыцці. І нарэшце, на падставе гэтае барацьбы і дара Божага ў таемствах вырастае сустрэча зусім інакшага кшталту, пастаянная, якая ўсё паглыбляецца і здзяйсняецца ў малітве. І вось пра малітву мне хочацца штосьці сказаць.

Мы часта думаем пра малітву ў статутных або фармальных катэгорыях. Часта, прыйшоўшы на

споведзь, людзі гавораць, што не выконвалі свайго малітоўнага правіла альбо тых ці іншых малітоўных дзеяў. Але малітва не толькі ў гэтым. Зразумела, і гэта адыгрывае сваю ролю (да гэтага я вярнуся), але самая сутнасць малітвы — гэта нашая памкнёнасць да Бога, памкнёнасць да таго, каб сустрэць Яго вочы ў вочы. І ў выніку малітва — гэта стаянне перад Богам, якое пачынаецца са словаў і вырастае і паглыбляецца да сузіральнага маўчання.

Я прыгадваю цяпер аднаго заходняга падзвіжніка, прыходскага святара вёсачкі ў цэнтральнай Францыі. Ён часта бачыў, што ў царкве сядзіць стары, — сядзіць, глядзіць перад сабой і маўчыць. І аднога разу святар звярнуўся да яго з пытаннем: «Дзеду, чаго ты гадзінамі тутака робіш? Вуснамі не варушыш, пальцы твае не бегаюць па ружанцы: чым ты заняты?» І стары на яго зірнуў і ціха адказаў: «Я на Яго гляджу, Ён глядзіць на мяне, і мы такія шчаслівыя адно з адным». Гэта была праўдзівая сустрэча ў глыбінях маўчання.

Я ўспамінаю іншага чалавека, невядомага свету, майго духоўнага айца, архімандрыта Афанаса (Нячаева). Перад сваёй смерцю ён мне напісаў: «Я спасціг таямніцу сузіральнага маўчання, цяпер я магу памерці», — і праз тры дні ён памёр. Самая глыбіня малітвы ў тым, каб сустрэць Бога вочы ў вочы (я кажу цяпер не пра спазіранне вачэй, а пра сустрэчу ў самых сховах і глыбінях нашае душы) і з Ім так быць. І, вядома, да гэтага варта імкнуцца, гэтаму мы павінны вучыцца.

Першае: мы павінны вучыцца маўчаць. Мы павінны навучыцца стаць перад Богам ці сесці перад

абліччам Божым і маўчаць, даць усім сілам уяўлення, усім думкам сцішыцца, усім пачуццям супакоіцца. Я вам магу зноў-такі даць прыклад гэтага.

Шмат гадоў таму, як толькі я стаў святаром, мяне паслалі ў дом для састарэлых. Там, сярод іншых, жыла бабулька ста аднаго году, якая пасля першага майго богаслужэння падышла да мяне і кажа: «Ойча Антоніе, я ад вас хачу парады. Ужо шмат-шмат гадоў я паўтараю малітву Ісусаву і ніколі не адчула прысутнасці Божае. Скажыце, што мне рабіць». Я з гатовасцю, з радасцю ёй адказаў: «Знайдзіце чалавека, дасведчанага ў малітве, і ён вам скажа». Яна на мяне паглядзела і сказала: «Ведаеце, за доўгае сваё жыццё я абышла ўсіх людзей, якія ўсё або штонебудзь знаюць, і нічога разважнага ад іх не пачула. Пабачыўшы вас, я падумала: ён, напэўна, нічога не ведае, дык, можа, ён выпадкова што-небудзь — выбачайце за выраз — «ляпне», што мне на карысць пойдзе». Я падумаў, што калі ўжо такая гаворка, то магу заняць становішча варлаамавай асліцы. Памятаеце гісторыю, як прарок ехаў на няўгодную Богу справу, і не бачыў, як пасярод дарогі стаіць ангел з мячом і не пушчае яго; а асліца бачыла, павярнулася да Варлаама і сказала: калі хочаш ісці далей, ідзі сам, я не хачу памерці ад мяча ангельскага... І вось я вырашыў: добра, калі асліца магла загаварыць, паспрабую і я, як асліца, што-небудзь сказаць. І адказаў бабульцы: «Як вы думаеце — калі можа Бог паспець што-небудзь вам сказаць або праявіць Сваю прысутнасць, калі вы ўвесь час гаворыце?» — «Дык што ж рабіць?» — «А вось што зрабіце. Заўтра раніцою ўстаньце, прыбярыцеся, прыбярыце свой

пакой, запаліце лампаду перад абразамі, а тады сядзьце так, каб бачыць абразы, і лампаду, і адчыненае акно (было гэта ўлетку), і фотаздымкі любых людзей на каміне; вазьміце пруткі і воўну ды вяжыце моўчкі перад абліччам Божым, і нават не думайце ніводнай малітвы гаварыць, сядзіце ціхенька і вяжыце». Яна паглядзела, я б сказаў, больш з недаверам, чым з надзеяй, і пайшла. На наступным тыдні я мусіў там ізноў служыць, і агледзеўся, спадзеючыся, што яе няма, а то я атрымаю ад яе. Яна была!.. Пасля набажэнства яна падыходзіць і кажа: «Ойча Антоніе, а ведаеце — выходзіць!» Я спытаў: «Што выходзіць?» — «Я зрабіла тое, што вы сказалі. Села моўчкі вязаць, вакол было ціха; потым я пачала чуць бразганне пруткоў, і гэты гук як бы паглыбіў пачуццё маўчання вакол мяне. І чым больш я адчувала маўчанне, тым больш адчувала, што яно — не проста адсутнасць шуму, а што ў ім ёсць нешта іншае, што ў сарцавіне гэтага маўчання нейкая прысутнасць. І раптам я адчула, што ў сарцавіне гэтага маўчання — Сам Госпад. І тады я зразумела, што магу маліцца словамі ці не маліцца — усё адно: я з Ім. Ён на мяне глядзіць, я гляджу на Яго, і так добра нам разам». Тут яе досвед супаў з досведам таго простага селяніна з французскае вёскі, пра якога я гаварыў раней. І пасля гэтага яна ведала, што калі хоча маліцца і адчуць, спазнаць прысутнасць Божую, то ёй досыць самой замоўкнуць да моманту, калі яна праб'ецца праз той шум думак, бязладдзе пачуццяў, якія раней у ёй пераважалі, — і адчуе, што цяпер яна можа гутарыць з Богам, таму што яна перад Яго Абліччам. Гэта вельмі важны

момант, і мы ўсе павінны гэтаму вучыцца. Тое, што я кажу, — не мая прыдумка: пра гэта падрабязна і яскрава піша святіцель Феафан Затворнік.

Аднак мы не можам жыць пастаянна такім малітоўным жыццём; ёсць і іншыя моманты. Мы чытаем малітвы і гэтыя малітвы чытаць неабходна, бо мы не можам, пры нашым малым духоўным досведзе, задавальняцца такім сузіральным станам. Мы не даходзім да яго адразу, нам патрэбная падтрымка — і нам дадзеныя ранішнія малітвы, вячэрнія малітвы, богаслужэнне, акафісты і г. д. Як нам з імі абыходзіцца?

Мне часта кажуць: «Я чытаю ранішнія, вячэрнія малітвы і не магу адгукнуцца на ўсё, што там сказана». Я заўсёды ўказваю суразмоўцу: «Як ты можаш чакаць, што будзеш адгукацца на ўсё, што там сказана? Ты паглядзі: над кожнай малітваю стаіць імя якога-небудзь святога: Васіля Вялікага, Сімяона Метафраста, Яна Златавуста і г. д. Няўжо ты можаш марыць аб тым, каб, пераходзячы з малітвы ў малітву, перажыць, як бы злучыцца з досведам усіх гэтых святых, гэта значыць, змясціць у сабе малітоўны досвед пяці або дзесяці святых, якія напісалі ці склалі гэтыя малітвы?»

Я дарма выразіўся «напісалі ці склалі». Малітвы, якія ў нас ёсць, ці гэта псалмы, ці гэта змест нашага малітоўніка, не былі «напісаныя», ніхто не сядзеў перад пісьмовым сталом і не складаў малітваў. Гэта крык душы, які вырваўся, як кроў ліе з раны, у момант альбо надзвычайнае радасці, альбо пакаяння, альбо роспачы ці болю, альбо надзеі; усе гэтыя пачуцці святы пасля захаваў на паперы, каб не за-

быць таго, што з ім у нейкі момант здарылася. І калі мы хочам маліцца малітвамі святых, мы павінны, па-першае, іх чытаць шчыра, то бок распачынаючы малітву, звярнуцца да святога і сказаць яму: «Святы Васіле.., святы Яне.., святы Сімяоне..! Я буду скарыстоўваць твае малітвы, але я не ў стане іх змясціць. Я буду іх паўтараць усёй шчырасцю сваёй, усім сваім розумам, усім разуменнем, а ты вазьмі іх і ўзнясі з тваёю ўласнаю малітваю да пасаду Божага!» Гэта ўжо пачатак нашых зносінаў з дадзеным святым і з тым, што ён заклаў у сваю малітву. А ён у гэтую малітву заклаў сваю веду пра Бога, сваю веду пра сябе самога, свой жыццёвы досвед, сваю патрэбу, — усё гэта ён уліў у малітву. І калі мы будзем чытаць гэтую малітву, некаторыя яе моманты будуць нам зразумелымі і блізкімі, бо яны ўсечалавечыя, а некаторыя будуць для нас закрытымі і незразумелымі, нам не па змозе будзе сказаць ад саміх сябе некаторыя словы, вымаўленыя святым цалкам праўдзіва з глыбіняў свайго досведу.

Ізноў-такі, магу вам прывесці прыклад. Аднойчы я, калі быў юнаком, «насмерць» пасварыўся з адным сваім таварышам. Я прыйшоў да айца Афанасія, запытваю: «Ойча Афанасіе, што мне рабіць? Я пасварыўся з Кірылам і не магу яму дараваць таго, што ён мне зрабіў. Але ў малітве «Ойча наш» гаворыцца: «Выбач, як і я выбачаю». Што мне рабіць?» Айцец Афанасій на мяне спакойна паглядзеў і сказаў: «Дойдзеш да гэтага месца — скажы: «Не прабачай мне, бо я Кірылу прабачыць не магу»»... — «Я не магу гэтага сказаць!» — «Нічога іншага зрабіць нельга». Я паспрабаваў, дайшоў да гэ-

тага месца і не мог гэтых словаў вымавіць. Вярнуўся да айца Афанасія. «Ну, — кажа ён, — калі ты не можаш шчыра сказаць гэтых словаў, то пераскоч праз гэтае прабачэнне». Я паспрабаваў: немагчыма! Гэтае прабачэнне рубам стаіць між маім збаўленнем і маёй загубай. Вярнуўся зноўку да айца Афанасія. Ён кажа: «І што, табе страшна, што ты гінеш? Тады вось што паспрабуй зрабіць. Скажы: «Госпадзе, я вельмі хацеў бы прабачыць Кірылу, ды не магу. Ці можаш Ты мне прабачыць настолькі, наколькі я хацеў бы яму прабачыць?»» Я паспрабаваў — і гэта атрымалася. А пасля паступова, пераходзячы ад аднаго адцення да іншага, я раптам убачыў: якая дурасць! Вядома, я магу прабачыць Кірылу! Ён перада мною нават і не вінаваты, мы абодва адзін перад адным вінаватыя!.. Я спачатку з ім памірыўся, а тады здолеў свабодна, спакойна прамаўляць гэтыя Боскія словы, вырашальныя для нашага лёсу, якія нібы Чырвонае мора, праз якое мы мусім прайсці з рабства ў Абяцаную зямлю.

Значыць, належыць чытаць малітвы шчыра, і калі мы не можам чагосьці вымавіць абсалютна шчыра, мы павінны Госпаду сказаць: «Я вымаўлю словы святога, які напісаў гэтую малітву, але ад сябе я не магу іх сказаць. Памажы мне калі-небудзь дарасці да гэтае меры!» Але дарасці да гэтай меры немагчыма, калі мы будзем проста гэтыя малітвы паўтараць, ніколі да іх не вяртаючыся. І трэба зрабіць дзве вельмі важныя рэчы. Па-першае, тое, што святы Феафан Затворнік нам наказвае: прадумваць і прачуваць кожную малітву не ў момант, калі мы здзяйсняем наша малітваслоўе, а ў моманты, калі мы можам

сесці спакойна, прачытаць гэтую малітву, удумацца ў яе і ставіць перад сабой пытанне: вось што такі святы ведаў пра Бога, пра сябе, пра жыццё; што я ведаю пра гэта?.. І прачуць, давесці да свае свядомасці, да свайго сэрца і як бы да глыбіняў сваіх успамінаў, з глыбіняў свайго сэрца вывесці на паверхню ўсё тое, што адпавядае словам гэтае малітвы. Так, што калі я буду чытаць яе перад Богам, увесь духоўны і чалавечы досвед пачне ажываць, рабіцца маёй малітваю; вакол кожнага слова будуць крышталізавацца моманты майго ўласнага досведу.

І другое мы павінны неадменна рабіць. Некаторыя малітвы могуць быць як бы за праграму жыцця. Напрыклад, у вячэрнім правіле ёсць дваццаць чатыры караценькія малітвы святога Яна Златавуста. Ён іх прадугледжваў на кожную гадзіну дня. Мы іх чытаем увечары, калі можна так выразіцца, «агулам». Але мы можам, да прыкладу, на кожны дзень выбраць адну з гэтых малітваў і прысвяціць ёй не цэлы дзень, а паўдня ці некалькі гадзін. «Госпадзе, у пакаянні прымі мяне». Вось, прадумай, прачуй, што значыць пакаянне. І калі прадумаеш і прачуеш, прысвяці хоць бы некалькі гадзін гэтага дня таму, каб вучыцца каяцца. Ёсць іншыя малітвы: «Госпадзе, дай мне слёзы, і памяць пра смерць, і скруху... Госпадзе, дай мне цнатлівасць, паслухмянасць і пакорлівасць...» Калі ўзяць кожнае з гэтых словаў і паставіць сабе правілам: на працягу аднаго дня (большай часткай мы на гэта не здольныя, але хоць некалькі гадзін ці паўдня) я супраць гэтага грашыць не буду, я буду выконваць усё што змяшчаецца ў гэтым слове, — то кожная малітва пачне

ажываць. І калі я буду станавіцца на малітву перад Богам, я буду не проста паўтараць малітвы святых, а буду словамі святых узносіць Богу сваю малітву. І тады выходзіць тое, што адзін хлапчук неяк сказаў сваёй маці, пасля таго, як яна прымусіла вычытаць вячэрнія малітвы: «Мама, цяпер што мы намалітвасловілі, давай сабе ў радасць памолімся Богу, скажам Яму самі тое, што мы пра Яго адчуваем ці што нам хочацца Яму сказаць». Вось з гэтага нам бы пачаць.

Пра хваробы

Мне хочацца закрануць пытанне пра хваробы — цялесныя і, асабліва, душэўныя. Як Царква ставіцца да хваробы, як асобны вернік павінен ставіцца да сваёй хваробы і да хваробы блізкіх людзей? Пераважна, да ўласнае хваробы лягчэй ставіцца спакойна і мужна, чым да хваробы дарагога чалавека, калі ён пакутуе амаль нясцерпна і ідзе да сваёй смерці.

З гледзішча праваслаўнае веры, хвароба, гэтак жа сама, як і смерць, — гэта вынік першаснага адпадзення чалавека ад Бога. Бог — гэта гармонія, Бог — гэта жыццё, у Ім — поўнасць усяго. Чалавек страціў жыццяздольнасць, таму што адпаў ад Бога, і пустэча, якая засталася, запоўнілася смяротнасцю і змогаю хварэць. Як правіла, гэта датычыць ўсіх нас. Але перад намі можа паўстаць іншае пытанне: няхай мы, грэшнікі, хварэем, гэта вынік нашага стану, таго, што мы не цалкам злучаныя з Богам, ці, у кожным разе, не цалкам да Яго звернутыя. Але чаму хварэюць святыя? Чаму яны, нібыта ўплеценыя ў ласку Божую, могуць хварэць?.. Тут іншы момант, той самы момант, што з'яўляецца перад намі ў страшныя хвіліны ўкрыжавання Хрыста і Ягонае смерці. Святы нясе на сабе крыж усяе зямлі, святы — гэта чалавек, які разам з Хрыстом нясе на сабе наступствы чалавечага граху. Я прыгадваю цяпер аднога валаамца. Ён быў паслушнікам цягам

пяцідзесяці гадоў, на працах страціў нагу, быў ужо састарэлым, калі яго сустрэў айцец Афанасій, які наведаў тады Валаам у пошуках духоўнага жыцця. Ён запытаўся гэтага старога: «Скажы, чаму ты пасля пяцідзесяці гадоў не прымаеш пострыгу, застаешся паслушнікам?» І той адказаў: «Я не гатовы. Я не навучыўся спачуваць у пакутах і плакаць плачам усяе зямлі». Вось чаму святы можа хварэць, можа пакутаваць: бо ўмее спачуваць у пакутах, раздзяляць пакуты і плакаць над пакутамі, над грахоўнасцю, над адпадзеннем усёй зямлі ад Бога.

Але калі мы гаворым пра хваробы, мы гаворым, вядома, пераважна пра такіх жа, як мы самі, людзей. Дык што ж нам рабіць? Людзі «пабожныя» часта кажуць мне: «Навошта мне ісці да лекара? Я магу пайсці і папрасіць святара памаліцца або магу папрасіць, каб мяне памазалі святым ялеем». Так, можаш; але нашто гэтак рабіць, калі Бог даў нам іншыя сродкі, больш даступныя, больш простыя, і якія не вымагаюць ад цябе тае суцэльнае веры, якой вымагае зварот да таемстваў і да дзеянняў Царквы?... Гэта словы святога Серафіма Сароўскага. Ён казаў аднаму свайму суразмоўцу: «Лячыся, таму што Бог стварыў і лекі, і лекара, і ў ягоных руках тваё выздараўленне». Тут ён паўтарае тое, што можна прачытаць у 38-м раздзеле кнігі прамудрасці Ісуса, сына Сіраха: што Бог сапраўды стварыў і лекі, і лекара, і даў яму ўладу часам ацаляць:

«Шануй лекара паводле патрэбы ў ім, бо Госпад стварыў яго, і ад Усявышняга — лекаванне. Госпад стварыў з зямлі лекі, і разважны чалавек не будзе грэбаваць імі. Для таго Ён і даў людзям веды, каб

праслаўлялі Яго ў дзіўных справах Ягоных: імі Ён лечыць чалавека і знішчае хваробу ягоную. Той, што рыхтуе лекі, робіць з іх сумесь, і заняткі ягоныя не скончаюцца, і праз яго стаецца дабро на ўсёй зямлі. Сыне мой! У хваробе тваёй не будзь неахайным, але маліся Госпаду, і Ён ацаліць цябе. Пакінь грахоўнае жыццё і выпраў рукі твае, і ад усякага граху ачысці сэрца. Узнясі духмянасці і памятную ахвяру — хлебнае прынашэнне з найлепшае мукі, і зрабі прынашэнне сытае, быццам ты ўжо паміраеш; і дай месца лекару, бо і яго стварыў Госпад, і няхай не аддаляецца ён ад цябе, бо ён патрэбны. У іншы час і ў іх руках стаецца поспех; бо і яны моляцца Госпаду, каб Ён дапамог ім даць нядужаму палёгку і ацаленне для працягу жыцця» (Сір 38: 1-2, 4, 6-14).

Як бачым, тут сказана яшчэ адно, вельмі важнае. Перш, чым ісці да лекара, і цягам усяго часу, які ты выкарыстаеш, каб быць вылечаным натуральным чынам, шукай пакаяння, шукай духоўнага ачышчэння, таму што хвароба звязаная, з аднога боку, з усеагульным лёсам чалавека, з ягоным знясіленнем, з тым, што мы смяротныя і падлягаем пакутам і хваробе; але таксама звязаная з тым станам душы, які пераважае ў нас. Ёсць цудоўнае месца ў Святым Пісанні (не магу зараз працытаваць дакладна), якое, апісваючы лёс чалавека пасля падзення, кажа: і паступова ў род чалавечы ўсялілася смерць... Смерць увайшла, але людзі жылі доўга. І калі мы паглядзім на радавод чалавецтва, працягласць жыцця ўсё меншала, бо людзі слабелі, слабела і рабілася менш глыбокай іх сувязь з Богам, і яны станавіліся ўсё больш і больш падуладнымі смерці. Да тэмы смерці мы яшчэ вер-

немся. Але цяпер я хачу сказаць: як толькі чалавек захворвае, ён павінен увайсці ўнутр сябе і задаць сабе пытанне, наколькі Ён далёка ад Бога, якая ў ім ёсць няпраўда датычна бліжняга, датычна самога сябе, у якой ступені ён зневажае ці нявечыць вобраз Божы, які закладзены ў ім, і разам з тым у зміранасці, не спадзеючыся, што моцаю свайго цудоўнага пакаяння ён можа перамагчы цялесную хваробу, ісці да лекара і прымаць ад яго лячэнне. Гэта вельмі, вельмі істотны момант.

Але, мажліва, яшчэ больш пытанняў узнікае ў людзей, калі чалавек занядужвае на душэўную хваробу. Што такое душэўная хвароба? Мы ведаем цяпер, што наш псіхічны стан у вялікай ступені залежыць ад таго, што адбываецца фізіялагічна, з гледзішча фізікі, хіміі, у нашым мозгу і ў нашай нервовай сістэме. Таму нельга кожную псіхічную немач прыпісваць ліху, граху ці дэману. Гэткая хвароба значна часцей выклікаецца пашкоджанай нервовай сістэмай чалавека, чым д'ябальскім насланнём або такім грахом, які чалавека адрывае ад усякае повязі з Богам. І тут медыцына ўваходзіць у свае правы і можа шмат чаго зрабіць.

Мне прыгадваецца адзін выпадак. У Парыжы быў выбітны таленавіты мастак-іканапісец. Ён раптоўна захварэў, стаў паступова вар'яцець. У яго былі галюцынацыі, ягоны ўнутраны свет пазбавіўся пачуцця рэчаіснасці. Ягоныя сваякі вырашылі яму не пярэчыць, спадзеючыся, што ён супакоіцца. Але яму ўсё горшала, і тады гэтая пабожная сям'я звярнулася да Царквы. Нашага маладога іканапісца адчыталі, спавядалі, крапілі святой вадой, прычашчалі, мазалі

асвечаным ялеем, а ён хварэў усё больш і больш. Я тады быў лекарам, і да мяне звярнуліся з пытаннем: што рабіць?.. За мой адказ на мяне вельмі раз'юшыліся, я сказаў: «Кіньце вы гэта, ён хворы, а не апанаваны. Адпраўце яго ў лякарню, каб там ужылі лячэнне электрашокам». (Тады гэта было адзіным, што ўмелі рабіць у гэтай галіне). І я памятаю, як абурылася сям'я і духавенства: «Як?! А раптам гэта насамрэч апанаванасць? Што ты ведаеш пра гэта?» Я адказаў: «Я ведаю адно — калі гэта апанаванасць, то электрашок аніяк не пашкодзіць дэману і не дапаможа хвораму, а калі гэта проста хвароба, то наш сябар ацаліцца». І праз год ён ацаліўся. (Заўважу мімаходзь: святар не заўсёды можа быць прафесійным псіхіятарам, але ён павінен прынамсі досыць цікавіцца тым, што адбываецца з людзьмі вакол яго, каб мець нейкія веды пра тое, як праяўляецца душэўная хвароба. Калі псіхічна хворы чалавек выяўляецца і вернікам, ягоны душэўны стан кідае цень на ўсё, у тым ліку і на ягонае жыццё ў Царкве. І вельмі важна, каб святар быў у стане сказаць: гэта — хвароба, а гэта — праўдзівы містычны досвед).

Але за час хваробы гэтага мастака здарылася нешта надзвычай цікавае. Ён уступіў у хваробу няспелым іканапісцам, а выйшаў з хваробы пасталелым, ягоныя абразы сталі іншымі, сталымі, глыбокімі. І мы задавалі сабе пытанне: што ж гэта такое? якім чынам гэта можа быць?... Адказ я знайшоў пазней у святога Яна Кранштацкага. Ён гаворыць, што ёсць душы вельмі крохкія, якія б маглі быць разбітыя навакольным светам, і Бог спускае паміж такой душой і светам заслону вар'яцтва ці нейкага часткова-

га адчужэння і неразумення, пакуль гэтая душа не саспее. Гэтая душа можа не саспець увогуле на гэтай зямлі, але яна будзе саспяваць у цішыні свайго так званага «вар'яцтва», адлучанасці ад навакольнага свету і ўвойдзе ў вечнасць сталай, пасталелай. А часам бывае, што гэтая заслона здымаецца, як яно здарылася з гэтым іканапісцам, і раптам выяўляецца, што гэтай заслонай ён пераражыў штосьці, што толькі між ім і Богам адбывалася, у што не ўмешвалася ніякая чалавечая сіла, і ў выніку ён зрабіўся сталым чалавекам.

Мне падаецца, што вельмі важна памятаць гэтыя розныя моманты. Калі чалавек захворвае псіхічна, трэба памятаць, што гэта можа быць фізіялагічная з'ява, на якую павінен звярнуць увагу лекар. З іншага боку, адначасова мы павінны за гэтага чалавека маліцца, як мы молімся за любога чалавека ў нядолі, маліцца ўсімі высілкамі душы. Мы можам скарыстаць і некаторыя царкоўныя дзеянні: памазаць чалавека асвечаным ялеем альбо, калі ён у стане, дапускаць чалавека да Святога Прычашчэння; але ведаць, што Божая моц будзе дзейнічаць надвае: праз таемствы і — яна ж — праз лекара і лекі.

Іншы раз Бог пастанаўляе, што дзеянне павінна быць здзейснена зямнымі спосабамі, бо тут у падмурку захворвання не было ні граху, ні ліха, а быў момант, калі чалавек мае быць адчужаны ад таго, што можа яго зламаць, спакусіць, аддаліць ад бачання дасканалага хараства ці праўды, пакуль ён не ўмацуецца і не стане здольным жыць у паўзмроку гэтага свету і разам з тым жыць святлом Божым.

Пра святасць і духоўнасць

Мы вызнаем, што Царква святая; і апостал Павел гаворыць усім хрысціянам: «Вы святыя». Што Царква святая — цалкам зразумела, але што ўсе хрысціяне святыя — ставіць перад намі сур'ёзныя пытанні, таму што, нават калі яны прылучаюцца да святасці Царквы, гледзячы на саміх сябе і на людзей вакол нас, мы не можам гэтае слова ўжыць са спакойнай упэўненасцю.

Пачнем са святасці Царквы. Святасць Царквы заключаецца ў тым, што яна — месца, дзе Бог у Сваёй паўнаце прысутнічае сярод Свайго народу. Хрыстос Богачалавек, як чалавек і як Бог, запаўняе Сабой Царкву; Дух Святы вее ў ёй, і ў Хрысце і ў Святым Духу мы з'яўляемся ўжо не прыёмнымі, а роднымі дзецьмі Бога і Айца. Зноў-такі, гэтыя словы — з адвагаю, але яны належаць не мне, а святому Ірынею Ліёнскаму. І ў гэтым дачыненні, мы можам сказаць, што Царква святая ўсёй святасцю Бога, Які ў ёй жыве і дзеіць.

Што ж сказаць пра нас саміх? У залежнасці ад нашай вернасці, ад нашага ўрастання ў таямніцу Царквы і ў таямніцу Бога, мы у нейкай ступені прылучаемся гэтай святасці. Але калі апостал Павел гаворыць пра тое, што ўсе хрысціяне святыя, ён зусім не мае на ўвазе, што мы ўсе ўжо дасягнулі святасці — я ўжо не кажу: Хрыстовай, а нават святасці тых святых, якіх ушаноўвае Царква.

Святасць пачынаецца ў момант, калі мы прысвечаны Богу, прынесены Яму ў дарунак, робімся Ягонай уласнасцю. Гэта не значыць, што ў той момант чалавек ужо робіцца святым у тым сэнсе, у якім ён пакліканы быць падобным да Серафіма Сароўскага, Сергія Радaнежскага, Ніла Сорскага і мноства іншых мужчын і жанчын. Гэта гаворыць адно пра тое, што цяпер паводле ўласнай волі, з поўнай сваёй згоды, з усёй сваёй рашучасцю мы аддаём сябе Богу, цяпер мы Божыя да канца. У гэтым сэнсе святасць чалавека, безумоўна, спалучаецца з якойсьці часткай грахоўнасці, бо чалавек аддае сябе Богу і гаворыць: Госпадзе, я хачу быць Тваім і толькі Тваім! — а разам з гэтым у ім яшчэ ёсць недасканаласць, якая мусіць быць перапрацаваная і паступова знікнуць. Вось два полюсы святасці: Боская святасць Збаўцы Госпада Ісуса Хрыста і зародкавая святасць таго, хто сам сябе аддае як быццам ва ўласнасць Богу, ці, у выпадку хрышчэння дзяцей, таго, хто прыносіцца сям'ёй Богу, бо сям'я верыць у Яго і ведае, што аддаць дзіця Богу — гэта самае лепшае, што можна для яго зрабіць.

Пытанне святасці звязанае яшчэ з іншым словам: духоўнасць. Мы пастаянна гаворым пра духоўнасць, як быццам чалавек — не толькі святыя, але і мы, грэшнікі, — можам жыць адным духам, і забываемся, што ў чалавеку ёсць і душэўнасць, і цялеснасць. Трэба зразумець, што такое духоўнасць па сутнасці. Духоўнасць — гэта не дасягненне, а шлях; духоўнасць заключаецца ў тым, што Святы Дух дзейнічае ў нас, бо мы Хрыстовыя і паступова ўзрастаем дзеяннем Святога Духа. Гэта значыць, што мы павінны злучыцца з Хрыстом і з Духам Святым усёй сваёй

істотай, а не толькі той часткаю нашага быцця, якая ўжо роднасная Богу духам нашым. Святы Серафім Сароўскі гаворыць, што святасці можна дасягнуць дзякуючы рашучасці, а рашучасць — гэта прадмет волі, гэта прадмет розуму, свядомасці; і таму нашая душэўнасць выконвае абсалютна вырашальную ролю. Наш дух не можа з месца зрушыцца без таго, каб нашая душэўнасць не ўдзельнічала ў ягоным адраджэнні і ўзыходжанні да Бога. Гэта вельмі істотны момант, бо мы часта думаем, быццам замест таго, каб здзяйсняць душэўны подзвіг, мы можам звярнуцца да таемстваў, звярнуцца да малітвы, звярнуцца да Бога і казаць: Госпадзе, зрабі за мяне тое, чаго я не збіраюся рабіць дзеля Цябе, ці тое, чаго я не магу зрабіць, бо ў мяне не стае ані рашучасці, ані натхнення!.. Не, у нас ёсць гэты душэўны момант, які патрабуецца для таго, каб запаліўся дух і каб Бог усё глыбей мог з намі злучыцца.

Але гаворка не толькі пра душэўнасць і пра духоўнасць, пра дух і пра душу, але таксама пра чалавечае цела, бо цела чалавека было створанае Богам для таго, каб быць ёмішчам ягонае душы і ягонага духа. Гэта трэба зразумець: нашае цела гэткае ж святое, як і наш дух, і мусіць быць працятым Боскай ласкай да самых глыбінь. Святы Сілуан Афонскі ў адным са сваіх пісанняў гаворыць, што подыхам Святога Духа, дзеяннем Святых Таемстваў, прылучанасцю нашай Богу, калі мы аддаемся Яму альбо нашымі бацькамі, альбо свабоднай сваёй воляй, ласка Божая кранаецца спачатку нашага духу; а потым, калі запаліцца наш дух, гэтае полымя паступова працінае і душэўнасць нашую. У святле тае ласкі,

якая ўжо азарыла наш дух, мы стаемся здольнымі прымаць рашэнні, якія іначай не маглі б прымаць, стаемся здольнымі разумець тое, што іначай не маглі б зразумець. І калі чалавек дайшоў да паўнаты якойсьці прылучанасці Богу (паўнаты, вядома, адноснай), то гэтая ласка сыходзіць і працінае і нашае цела. Гэтым тлумачыцца тое, што целы святых часта застаюцца нятленнымі, іх не кранаецца тлен, псота. Дык вось, святасць пачынаецца з моманту, калі мы аддаем сябе Богу, яна ўзрастае па меры таго, як мы рашуча змагаемся з усім тым, што нам замінае быць Божымі, сябрамі і вучнямі Хрыста, храмамі Святога Духа. І далей яна працінае нас да канца.

І тут, мажліва, варта падумаць пра тое, што здзяйсняецца ў нашых чалавечых стасунках. Часта людзі думаюць, што могуць мець лучнасць толькі духоўна, гэта значыць, забываючыся на сваю душэўнасць і сваю цялеснасць; што можна маліцца за свайго бліжняга — і досыць з яго, у той час, як бліжні, мажліва, мае патрэбу шмат у чым іншым: у душэўнай дапамозе, у цялеснай дапамозе. І тут мы павінны зразумець, што адбываецца. Мы мусім зразумець, што ў той ступені, у якой мы жадаем жыць духам, мы павінны раскрывацца да бліжняга тым бокам нашай душэўнасці, якая ўжо ачышчаная. Гэта значыць (у Евангеллі пра тое гаворыцца ясна), што нашыя думкі павінны паступова ачышчацца, мы мусім змагацца за тое, каб ніякі бруд, ніякі тлен, ніякая нечысціня, ніякая няпраўда, аблуда не пранікалі ў нашую думку.

Але вы скажаце: што ж рабіць? Я ведаю, што на практыцы яно не так. Вось я станаўлюся на малітву, і як толькі пачынаю маліцца, у мяне пачынаюць

уліваецца аднекуль усялякія прыпаміны, уявы, фантазіі ці нават проста богазняважныя думкі... Пра гэта гаворыць святы Ян Лесвічнік: як толькі мы становімся на малітву, дэман падпаўзае да нас і нашэптвае нам усё, што можа нас адцягнуць ад малітвы. І не трэба ад гэтага бянтэжыцца; трэба проста яму сказаць: адыйдзі, не губляй часу, я ўсё адно буду працягваць маліцца... І ўрывак малітвы, які быў апаганены нячыстымі думкамі, трэба паўтараць раз за разам. Як адзін падзвіжнік казаў — калі вы будзеце гэта рабіць пастаянна, то дэман пабачыць, што чым больш ён на вас нападае, тым больш вы моліцеся, і адыйдзе ад вас. Гэта вельмі істотны момант.

Здараецца, што даводзіцца змагацца з той цемрай, якая падымаецца ў нас, часткова таму, што яна ў нас ужо ёсць, часткова таму, што яна нам навязваецца. Ёсць аповед з жыцця падзвіжнікаў пра тое, як аднаму манаху было даручана хрышчэнне жанчын, і як толькі ён браўся за даручэнне, у ім уздымаліся блудная пажада і паганыя думкі. Ягонае імя было Ян, і ён звярнуўся да святога Яна Хрысціцеля: «Святы Яне, ты быў чысты ад усякай заганнай думкі, — памаліся Богу, каб Ён мяне вызваліў ад гэтага бруду, бо я апаганьваю тую справу, якую раблю!..» І святы Ян Хрысціцель яму аб'явіўся і сказаў: «Я магу цябе вызваліць ад гэтага змагання, але калі я табе выпрашу гэта ў Бога, ты страціш вянец пакутніцтва. Працягвай змагацца, змагайся супраць нячыстых думак, супраць гэтых вобразаў, супраць паўстання плоці ў табе самім, змагайся бязлітасна, і раней ці пазней ласка Божая, якую ты прыклікаеш, пераможа ў табе самім, і тады ты атрымаеш вянец пакутніцкі»... Гэты

манах працягваў хрысціць і змагацца, і змагаўся да дня, калі ўраз стаўся свабодным ад усялякай нячыстай думкі і мог хрысціць гэтак, як, пэўна, хрысціў святы Ян Прадвеснік у водах Ярдану.

Таму не трэба бянтэжыцца ад таго, што ўпаўзае ў нашую душу. Не трэба бянтэжыцца і ад таго, што ў момант, калі мы молімся Богу, калі Госпад іл ье Сваё святло ў нашую душу, мы раптам пачынаем бачыць у нашай душы такую цемрадзь, такую нечысціню, такую погань, якой раней не адчувалі і не бачылі ў сваёй душы. І, апроч таго, трэба памятаць, што нашае цела, нашая душа, наш дух складаюць адно цэлае, якое мы паступова павінны ўключыць у таямніцу Божую; і тады чалавек робіцца цэльным, калі ягоная цялеснасць працінаецца ласкай з такой жа сілай, як і ягоны дух. Згадайце, як пры гутарцы з Серафімам Сароўскім Матавілаў пабачыў, што аблічча святога Серафіма азарылася, азарылася ягонае адзенне, увесь ён азарыўся падобна да таго, як Хрыстос заззяў на Фаворы, калі размаўляў з Майсеем і Іллём пра Свае будучыя пакуты, — Ён увесь азарыўся так, што нават Ягоная вопратка, паводле слова Евангелля, заззяла такой беллю, якой не мог бы дамагчыся ніводзін бялільшчык. Гэта звяртае нашую ўвагу на тое, што мы павінныя быць працятыя ласкай цялесна ў той самай ступені, як і душэўна, і духоўна, і што мы не павінны баяцца тае барацьбы, якая ў нас адбываецца. Барацьба — час, калі мы можам сказаць: Госпадзе, няўжо Ты мне давяраеш нагэтулькі, каб даручыць гэтую барацьбу з д'яблам, са злом, якое ўва мне яшчэ не вычарпана?.. Гэта момант, калі мы можам радавацца таму, што Бог нам дае магчымасць

за Яго, разам з Ім змагацца і перамагаць. І калі мы адольваем зло ў сабе, мы яго не толькі ў сабе перамагаем, мы яго перамагаем наогул, бо пераможаны дэман пераможаны для сусвету, ён паранены смяротна. Калі нейкі грэх у нас ацалёны, калі нічога не засталося ад яго, толькі калі нашая цэльнасць вырасла ў поўніцу сваёй меры, мы можам сказаць: цяпер гэтае зло памерла для свету...

Таму, калі мы сустракаемся ў нашым жыцці з духоўнай барацьбой, з душэўнай спакусай ці з цялеснай хваробай — я кажу цяпер не пра звычайную хваробу, а пра тое, што грэх у нас пачынае дзейнічаць з новай сілай, — мы можам дзякаваць Богу.

І мы можам яшчэ адно памятаць, надзвычай важнае: не цела ёсць прычынай і крыніцай зла ў нас. Адзін з падзвіжнікаў цалкам зразумела гаворыць, што цела ёсць цярплівцам, пакутнікам, цела ёсць ахвярай тае няпраўды, якая ў нас жыве душэўна і яшчэ духоўна. Таму, калі мы гаворым пра цялесныя, плоцкія грахі, мы гаворым адно пра тое, што грахоўнасць нашая, якая ўся жыве ў душэўнасці і духоўнасці, цяпер занявольвае нашае цела, апаганьвае нашае цела; каяцца мусіць не цела, а душа нашая. І гэта вельмі важна, бо занадта проста мы думаем пра нашае цела як пра выток спакусы ці зла. Выток — у нашай неачышчанай, неасвечанай душэўнасці і духоўнасці, што запалілася яшчэ не да канца.

Пра шлюб, пра дзяцей

Адзін з айцоў Царквы ўжо ў старажытнасці сказаў, што свет бы не змог стаяць без таемстваў, гэта значыць, без непасрэднага ўздзеяння Божага і без перамянення, якое гэтае ўздзеянне робіць над людзьмі; і што адзінае таемства, якое захавалася пасля адступлення чалавека ад Бога і страты раю, гэта таемства шлюбу. Шлюб — гэта таемства і ў старажытнасці, і па-за хрысціянскім досведам. Вядома, не ў тым жа сэнсе, у якім ён ёсць таемствам у хрысціянскай Царкве, але ён — таемства ў тым плане, што гэта момант, калі здзяйсняецца нешта, што інакш, чалавечымі сіламі, не магло б здзейсніцца. Гэта момант, калі ўзнаўляецца, наколькі гэта магчыма ў межах адпаўшага свету, тое адзінства між мужчынам і жанчынаю, тая цэльнасць усечалавека, пра якую гаворыцца на пачатку кнігі Быцця. Гэта момант каласальнае важнасці. Гэта момант, калі двое, таму што яны пакахалі адно аднаго, могуць стаць адной плоццю, гэта значыць, не толькі фізічнай плоццю, але і адной цялеснай рэчаіснасцю, якая ў сябе ўключае рознасць і душэўнасці, і духоўнасці.

Я хачу гэта крыху развіць. У Старым Запавеце мы чытаем пра тое, як чалавек быў створаны ўсечалавекам, і ў ім, паводле вучэння некаторых (далёка не ўсіх) айцоў, заключалася ўсё — і жаночае, і мужчынскае. Паступова чалавек пачаў узрастаць, выспяваць; і прыйшоў момант, калі ў адным чала-

веку ўжо не магла сумяшчацца паўната і жаночай, і мужчынскай істоты. Тады Бог прывёў да чалавека ўсю жывёлу, каб ён бачыў, што ў іх ёсць два полы, і адчуў, як сказана ў Пісанні, што адно ён самотны. І калі ён раптам зазнаў адзіноту сваю, Бог навёў на яго глыбокі сон і аддзяліў у ім мужчынскае ад жаночага. Але радзяліў не так, каб не засталося нічога таго ці другога ў кожным з іх. У кожным засталося нешта ад другога, што давала яму здольнасць пазнаваць сябе самога ў іншай істоце; ён і яна складалі адно. І калі Адам пабачыў перад сабой Еву, ён выгукнуў: «Гэта косць ад костак маіх, гэта плоць ад плоці маёй!..» Інакш кажучы: Гэта я! — і разам з тым: гэта я — перад уласнымі вычыма. Але гэта быў настолькі «я», гэта настолькі была еднасць духу, што яны сябе голымі не бачылі, яны бачылі сябе як адзінку, як чалавека ў дзвюх асобінах. Пазней, калі адбылося адпадзенне, яны ўраз пабачылі сябе голымі, гэта значыць чужымі адно аднаму. І вось з гэтага моманту пачалася барацьба за ўз'яднанне, цяга адно да аднаго, безнадзейная, сляпая цяга, крык: вярніся да мяне!..

І гэта здзяйснялася ў шлюбным каханні, у любові дваіх, якія, зірнуўшы адно на аднога, як бы пазнавалі сябе ў іншым і адначасова пазнавалі ў іншым не ягоную ўласную абмежаванасць, а новую паўнату, новае хараство, новы сэнс. І тады шлюб, таямніца гэтае сустрэчы, здзяйснялася ў тым, што яны адно аднога бачылі і пазнавалі сябе саміх, і пры гэтым — не проста сябе, а сябе папоўненымі, з паўнатой жыцця, якую яны могуць мець толькі адно з адным. Злучаючыся, яны і цялесна, і душэўна, і духоўна рабіліся (зноў-такі, наколькі было магчы-

ма і наколькі дагэтуль бывае магчыма ў адпаўшым свеце) усечалавекам. Гэта здуменная таямніца. Гэта паўната чалавека, выяўленая ў дзвюх асобінах. Вось таму айцец Царквы, пра якога я згадваў, гаварыў, што гэта таемства: цяпер раздзяленне, што здзейсненае грахом, няхай часткова, але ў значнай меры, вызначальнай меры, здымаецца, яны цяпер адно. І гэта ідзе вельмі далёка.

Я працытую і іншага айца Царквы (хаця зараз не магу згадаць ягонага імя), які кажа нешта, што многіх можа ўразіць; ён гаворыць, што шлюбнае злучэнне мужчыны і жанчыны можна параўнаць з той еднасцю, што здзяйсняецца між Хрыстом і вернікам, калі ён прылучаецца Святых Тайнаў... Вось мера, якую адзін з айцоў бачыў: цялесная еднасць між мужам і жонкай як паўната тае еднасці, якая ўжо дасягнутая душэўна і духоўна. Гэта значыць, што муж і жонка бачаць адно аднаго, нібыта самі сябе, але без тых ценяў, без таго знявечання, якое кожны чалавек можа ў сабе бачыць. Гэтае баччанне сябе ў той красе і паўнаце, якіх у сабе самім немажліва бачыць. І тады яны злучаюцца ў тое, што можна назваць словамі апостала Паўла «малой царквой». Сапраўды, у Хрысце, у Богу, ласкай Святога Духа яны робяцца адзінай плоццю, адзінай істотай, застаючыся пры гэтым непаўторнымі, выключнымі асобамі. Яны ўжо не ідывідуум, гэта значыць, не апошняя мяжа падзелу, тое, чаго далей дзяліць немагчыма, яны зрабіліся асобаю, ці асаблівай істотай, падобных якой больш няма. І стасункі мужа і жонкі ў ідэале — да чаго трэба імкнуцца ўсёй сутвай — не прагнасць, не жаданне валодаць, не хцівасць, а тра-

пяткое спазіранне і аддача сябе другому, і прыняцце другога ў сябе самога ў любові, у сузіральнай таямніцы любові. Гэта ідэал шлюбу.

Безумоўна, у адпаўшым свеце дзейнічаюць і іншыя сілы ў шлюбе. Бывае полавая пажада, бывае прагнасць; але бывае і тое, што двое злучаюцца дзякуючы той любові, якая скасоўвае ўсе межы: яны цяпер сталі адным. І калі нараджаецца дзіця, гэтае дзіця — не плод хцівасці, а плод аддачы аднаго чалавека другому, адной паловы другому ці другой.

І тут я хачу закрануць пытанне пра дзяцей. Сучасная навука ідзе насустрач таму, у што Царква верыла адпачатку: што ў момант, калі зараджаецца істота, у ёй ёсць уся паўната чалавечасці, яна ўжо чалавек. Можна сказаць, што ўцялесненне Хрыста здзейснілася ў той момант, калі архангел Гаўрыіл абяцаў Дзеве Марыі нараджэнне Сына і Яна адказала: «Вось, Я — раба Гасподняя, няхай будзе Мне паводле слова Твайго...». І гэтаксама бывае ў шлюбе. У момант, калі зараджаецца дзіця, уся будучыня наперадзе, і цяперашняя навука адкрыла цудоўныя рэчы. Яна адкрыла, што вельмі рана, як толькі пачынае фармавацца дзіця, яно можа ўспрымаць не толькі тое, што адбываецца ў маці, але і вакол яе. Да яго даходзяць гукі, да яго даходзіць ваганне паветра, праз сваю маці ён робіцца часткаю ўсяго навакольнага асяроддзя. Царкоўныя настаўнікі часта гаварылі пра тое, што як толькі зараджаецца дзіця, трэба ведаць — да яго даходзіць усё, што адбываецца з маці ці бацькам, або з наваколлем. Таму маці рэкамендавалася маліцца, але не фармальна, не толькі малітоўнічаць, а лучыцца з Богам, дзяліцца з Ім усёй

сваёй радасцю, усім сваім хваляваннем, даць Богу дзеіць у ёй. Але таксама рэкамендавалася маліцца ўголас, — хаця тады гэтага не ведалі, але цяпер мы ведаем, што гук гэтай малітвы незразумелым чынам даходзіць да зародка і да дзіцяці, што паступова фармуецца. Калі малітва прамаўляецца з трымценнем, ціха, уніклівa, дзіця паступова ўнутрана фармуецца і ўжо прылучаецца да таямніцы матчынай малітвы. Гэта чароўная думка.

Калі дзіця народзіцца, неабходна працягваць маліцца над ім, над калыскай, спяваць яму царкоўныя песні, маліцца царкоўнымі словамі. Ён яшчэ словаў не разумее, але праз гук голасу можа успрыняць малітоўны лад і праз яго ажыць да абсягу малітвы, абсягу прылучэння Богу.

А потым надыходзіць іншая пара, калі дзіця робіцца большым і ўжо можа само неяк удзельнічаць у жыцці. І тое, што з ім адбываецца тады, можа іграць каласальную і вызначальную ролю. Калі ў сям'і разлад, крык, узаемная варажнеча, то гэта разбівае цэльнасць ягонае душы; кожны выкрык узрушае ягоную душу і часам ушчэнт разбівае яе, як шкло можа разбіцца ад вялікага шуму.

Але яшчэ іншае. Па меры таго, як дзіця чуе малітоўныя словы, прылучаецца да іх гучання, яны робяцца часткаю плоці і крыві ягонае. І тут я хачу вам даць цудоўны прыклад, які застаўся ў мяне на душы.

Быў у нас тут пеўчы, Пётр Васілевіч Фёдараў, у яго быў неймавернай прыгажосці бас, і ўсіх нас ён натхняў сваімі спевамі. У нейкі момант ён захварэў на рак, злёг у больніцу. Я яго наведваў штодня. Напачатку мы з ім маліліся і спявалі разам, я — няўмела, бо ў мяне няма

належнага слыху і голасу — спявалі малебен аб ягоным выздараўленні і аб ягоных родных, якіх тады не было пры ім. Потым ён пачаў слабець, і я спяваў адзін. Аднаго разу я прыйшоў, і старэйшая сястра мне кажа: «Маглі б не прыходзіць, — ён непрытомны, памірае». Я зайшоў у ягоны пакой. Паабапал ложка сядзелі ягоныя жонка і дачка, якія толькі што прыехалі з далёкае Японіі і заспелі яго ўжо непрытомным чалавекам, каторы ўжо быў блізкім да смерці. Я ўспомніў тады тое, што ён мне гаварыў, як малітоўныя словы перапляліся з ягонай душою, і, сказаўшы жонцы і дачцэ сесці побач, укленчыў і пачаў, як умеў (гэта значыць дрэнна) спяваць яму велікапосныя, пакутныя песнаспевы. І паступова мы ўсе пабачылі, як прытомнасць расце ў ім, аднаўляецца, уздымаецца, і ў нейкі момант ён расплюшчыў вочы. Я яму сказаў: «Пётра Васілевіч! Вашыя жонка і дачка сядзяць злева ад вас. Вы паміраеце; развітайцеся з імі». Яны развіталіся спакойна, глыбока, кранальна; і тады я сказаў: «А цяпер можаце спакойна памерці». Ён знепрытомнеў і неўзабаве памёр. Вось так, гэтыя песнапенні, якія ён спяваў усё жыццё, яго вярнулі да жыцця на той кароткі час, які быў патрэбны яму, каб не пакінуць жонку ўдавой і дачку сіратою без апошняга развітання.

І яшчэ адзін прыклад, які мяне таксама вельмі ўразіў, з абсягу таго, што застаецца ў душы дзіцяці, калі яму дадзена чуць царкоўныя песнаспевы і спяваць іх. Шмат гадоў таму на Трохсвяціцельскім падвор'і быў вельмі стары дыякан. Ад старасці ён у значнай ступені згубіў голас, але спяваў на клірасе, бо толькі ён мог штодня гэта рабіць. Неяк я апынуўся з ім на клірасе. Ён чытаў і спяваў, я, як мог, спяваў.

Але ён чытаў і спяваў так шпарка, што ў мяне не выходзіла нават вачымі па кнізе прасачыць. Калі набажэнства скончылася, я яму сказаў: «Ойча Яўхіме! Вы сёння скралі ў мяне ўсю службу, але што горш — вы скралі яе ў сябе, таму што не маглі разумець тое, што вымаўлялі». Ён заплакаў і мне сказаў: «Ты мне даруй! Але ведаеш, я нарадзіўся ў страшна беднай вёсцы, мяне бацькі пракарміць не маглі і ў пяць гадоў аддалі мяне ў манастыр. Там я пражыў да рэвалюцыі, там навучыўся чытаць, спяваць, кожны дзень я чуў гэтыя службы, яны сталі часткаю маёй душы. Калі я бачу гэтыя словы, мне не трэба іх чытаць; калі я чую гэтыя песнаспевы, мне не трэба на іх засяроджвацца: як толькі я бачу слова — нібыта Божая рука кранае нейкую струну ў маёй душы, быццам у маёй душы арфа, і ўся душа пачынае спяваць. Таму я спяваю так хутка, што арфа пяе, душа пяе, — гэта мне было дадзена слова за словам цягам усяго майго дзяцінства і майго сталага жыцця...»

Вось што мы можам даць дзіцяці, і вось што ўяўляе сабой шлюб, дзе ў сарцавіне — Госпад Ісус Хрыстос, ласка Святога Духа, і дзе дзейнічае таямніца еднасці ў Хрысце.

Пра смерць

У мяне стаўленне да смерці своеасаблівае, і я хачу патлумачыць, чаму я да смерці стаўлюся не толькі спакойна, але з жаданнем, з надзеяй, з тугою па ёй.

Маё першае ўражанне пра смерць — размова з маім бацькам, які мне неяк сказаў: «Ты мусіш так пражыць, каб навучыцца чакаць сваю смерць так, як жаніх чакае сваю нявесту: чакаць яе, прагнуць яе, загадзя святкаваць гэтую сустрэчу, і сустрэць яе з пашанай, ласкава». Другое ўражанне (вядома, не адразу, а нашмат пазней) — смерць майго бацькі. Ён памёр раптоўна. Я прыйшоў да яго, у бедны пакойчык на гарышчы французскага дому, дзе быў ложак, стол, зэдлік і некалькі кніг. Я ўвайшоў у ягоны пакой, зачыніў дзверы і стаў. І мяне ахінула такая ціша, такая глыбіня цішы, што я, памятаю, усклікнуў уголас: «І людзі кажуць, што існуе смерць!... Якая гэта аблуда!» Таму што гэты пакой быў напоўнены жыццём, прычым такой паўнатой жыцця, якой па-за ёй, на вуліцы, на дварэ я ніколі не сустракаў. Вось чаму ў мяне такое стаўленне да смерці і чаму я з такой сілай перажываю словы апостала Паўла: «Для мяне жыццё — Хрыстос, смерць — набытак, таму што пакуль я жыву ў плоці, я аддзелены ад Хрыста...». Але апостал дадае далей словы, якія мяне дужа ўразілі. Цытата не дакладная, але вось што ён гаворыць: ён суцэльна жадае памерці і злучыцца з Хрыстом, але дадае: «Аднак,

для вас патрэбна, каб я застаўся сярод жывых, і я буду працягваць жыць». Гэта апошняя ахвяра, якую ён можа прынесці: усё, да чаго ён імкнецца, на што спадзяецца, што ён робіць, ён гатовы адкласці, таму што ён патрэбны іншым.

Смерці я бачыў дужа шмат. Я пятнаццаць гадоў працаваў лекарам, з якіх пяць — на вайне ці ў французскім Супраціве. Пасля гэтага я сорак шэсць год быў святаром і пахаваў паступова цэлае пакаленне нашае ранняе эміграцыі; так што смерці я бачыў шмат. І мяне ўразіла, што рускія паміраюць спакойна; заходнія людзі часцей са страхам. Рускія вераць у жыццё пасля смерці, сыходзяць у жыццё. І вось адна з рэчаў, якую кожны святар і кожны чалавек мусіць паўтараць сабе і іншым: трэба рыхтавацца не да смерці, трэба рыхтавацца да вечнага жыцця.

Пра смерць мы нічога не ведаем. Мы не ведаем, што адбываецца з намі ў момант паміранння, але хаця б зародкава ведаем, што такое вечнае жыццё. Кожны з нас ведае з досведу, што бываюць нейкія імгненні, калі ён жыве ўжо не ў часе, а такой паўнатой жыцця, такой радасцю, якая належыць не проста зямлі. Таму першае, чаму мы мусім вучыць сябе і іншых, гэта рыхтавацца не да смерці, а да жыцця. А калі казаць пра смерць, то гаварыць пра яе толькі як пра дзверы, якія шырока расчыняцца і нам дадуць увайсці ў вечнае жыццё.

Але паміраць усё ж няпроста. Што б мы ні думалі пра смерць, пра вечнае жыццё, мы не ведаем нічога пра саму смерць, пра паміранне. Я вам хачу даць адзін прыклад майго досведу ў часе вайны.

Я быў малодшым хірургам у прыфронтавым шпіталі. У нас паміраў малады салдацік год дваццаці пяці, маіх год. Я прыйшоў да яго ўвечары, сеў побач і кажу: «Ну, як ты сябе адчуваеш?» Ён паглядзеў на мяне і адказаў: «Я сёння ўначы памру». — «А табе страшна паміраць?» — «Паміраць нястрашна, але мне будзе балюча расставацца з усім тым, што я люблю: з маладой жонкай, з вёскай, з бацькамі; а яно сапраўды страшна: памерці ў адзіноце». Я кажу: «Ты не памрэш у адзіноце». — «Як гэта?» — «Я з табой застануся». — «Вы не можаце ўсю ноч прасядзець са мной...» Я адказаў: «Вядома, магу!» Ён падумаў і сказаў: «Калі нават вы і прасядзіце са мной, у нейкі момант я гэтага больш не буду ўсведамляць, і тады сыйду ў цемрадзь і памру адзін». Я кажу: «Не, зусім не так. Я сяду побач з табой, і мы будзем размаўляць. Ты мне будзеш апавядаць усё, што захочаш: пра вёску, пра сям'ю, пра дзяцінства, пра жонку, пра ўсё, што ў цябе ў памяці, на душы, што ты любіш. Я цябе буду трымаць за руку. Паступова табе стане ўтомна гаварыць, тады я стану гаварыць больш за цябе. А потым я пабачу, што ты пачынаеш драмаць, і тады буду гаварыць цішэй. Ты заплюшчыш вочы, я перастану гаварыць, але буду цябе трымаць за руку, і ты перыядычна будзеш сціскаць мне далонь, ведаць, што я тут. Паступова твая рука, хаця будзе адчуваць маю руку, больш не зможа яе пацісяаць, і я сам пачну ціснуць тваю руку. І ў нейкі момант цябе сярод нас болей не будзе, але ты сыдзеш не адзін. Мы ўвесь шлях здзейснім разам». І так, гадзіну за гадзінай, мы правялі гэтую ноч. У нейкі момант ён сапраўды перастаў сціскаць маю руку, я пачаў яго-

ную руку пацiскаць, каб ён ведаў, што я тут. Потым ягоная рука стала халаднець, потым яна раскрылася, і яго больш з намі не было. І гэта вельмі важны момант; вельмі важна, каб чалавек не быў адзін, калі сыходзіць у вечнасць.

Але бывае і па-іншаму. Часам чалавек хварэе доўга, і нават калі ён акружаны любоўю, клопатам — паміраць лёгка, хаця балюча (я пра гэта таксама скажу). Але вельмі страшна, калі чалавек акружаны людзьмі, якія толькі і чакаюць, каб ён памёр: маўляў, пакуль ён хварэе, мы палонныя ягонай хваробы, мы не можам адыйсці ад яго ложка, не можам вярнуцца да свайго жыцця, не можам цешыцца сваімі ўцехамі; ён, як цёмная хмара, вісіць над намі; як бы ён памёр хутчэй... І чалавек, які памірае, гэта адчувае. Гэта можа цягнуцца месяцамі. Родныя прыходзяць і халодна пытаюцца: «Ну як табе? нічога? табе нешта трэба? нічога не трэба? добра; ты ведаеш, у мяне свае справы, я яшчэ вярнуся да цябе». І нават калі голас не гучыць жорстка, чалавек ведае, што яго наведалі толькі таму, што трэба было адведаць, але што ягонай смерці чакаюць з нецярпеннем.

А часам бывае інакш. Чалавек памірае, памірае доўга, але ён любы, ён дарагі; і сам таксама гатовы ахвяраваць шчасцем знаходжання з любым чалавекам, таму што гэта можа даць радасць ці дапамогу некаму іншаму. Я дазволю сабе зараз сказаць нешта асабістае пра сябе.

Мая маці цягам трох год памірала ад раку; я яе даглядаў. Мы былі вельмі блізкімі, дарагімі адно аднаму. Але ў мяне была свая праца — я быў адзіным святаром лонданскага прыходу, і апроч таго раз на

месяц мусіў ездзіць у Парыж на сходы Епархіяльнае рады. У мяне не было грошай патэлефанаваць, таму я вяртаўся, думаючы: ці знайду я маці жывой, ці не?... Яна была жывая — якая радасць! якая сустрэча!... Паступова яна стала згасаць. Бывалі моманты, калі яна пазвоніць у званочак, я прыйду, і яна мне скажа: «Мне тужліва без цябе, пабудзьма разам». А бывалі моманты, калі мне самому было не ў змогу. Я падымаўся да яе, пакідаў свае справы, і казаў: «Мне балюча без цябе». І яна мяне суцяшала пра сваё паміранне і сваю смерць. І так паступова мы разам сыходзілі ў вечнасць, таму што калі яна памерла, яна з сабой знесла ўсю маю любоў да яе, усё тое, што між намі было. А было між намі так шмат! Мы пражылі амаль усё жыццё разам, толькі першыя гады эміграцыі жылі паасобку, таму што не было дзе жыць разам. Але потым мы жылі разам, і яна мяне ведала глыбінна. І неяк яна мне сказала: «Як дзіўна: чым больш я цябе ведаю, тым менш я магла б пра цябе сказаць, бо кожнае слова, якое я пра цябе сказала б, трэба было б выпраўляць нейкімі дадатковымі рысамі». Так мы дайшлі да таго моманту, калі ведалі адно аднога так глыбока, што сказаць адно пра другога нічога не маглі, а прылучыцца да жыцця, да памірання і да смерці — маглі.

І вось мы павінны памятаць, што кожны чалавек, які памірае, у такім становічшы, калі якаякольвек чэрствасць, абыякавасць ці жаданне «нарэшце б гэта скончылася» — невыносныя. Чалавек гэта адчувае, ведае, і мы мусім навучыцца пераадольваць у сабе ўсе самыя цёмныя, змрочныя, паганыя пачуцці і, забываючы пра сябе, глыбока за-

думвацца, углядацца, ужывацца ў іншага чалавека. І тады смерць робіцца перамогай: «О смерць, дзе тваё джала?! О смерць, дзе твая перамога? Уваскрэс Хрыстос, і нікога з мёртвых у магіле»....

Я хачу сказаць яшчэ нешта пра смерць, таму што тое, што я ўжо сказаў, вельмі асабістае. Смерць навокал нас увесь час, смерць — лёс усяго чалавецтва. Цяпер ідуць войны, паміраюць людзі ў жахлівых пакутах, і мы мусім навучыцца быць спакойнымі ў дачыненні да ўласнае смерці, таму што мы ў ёй бачым жыццё, зараджэнне вечнага жыцця. Перамога над смерцю, над страхам смерці заключаецца ў тым, каб жыць глыбей і глыбей вечнасцю і іншых прылучыць да гэтай поўніцы жыцця.

Але перад смерцю бываюць і іншыя моманты. Мы не адразу паміраем, не проста цялесна выміраем. Бываюць вельмі страшныя з'явы. Мне ўзгадваецца адна наша бабулька, такая Марыя Андрэеўна, цікавая маленькая істота, якая неяк да мяне прыйшла і гаворыць: «Ойча Антоне, я не ведаю, што з сабой рабіць: я больш спаць не магу. Цягам усяе начы ў маёй памяці ўздымаюцца вобразы маёй мінуўшчыны, але не светлыя, а толькі цёмныя, ліхія вобразы, што мучаюць мяне. Я звярнулася да лекара, прасіла даць мне нейкае снатворнае, але снатворнае не здымае гэтага марыва. Калі я прымаю снатворнае, я больш не маю сілаў як бы аддзяліць ад сябе гэтыя вобразы, яны становяцца трызненнем, а мне яшчэ горш. Што мне рабіць?» Я ёй тады сказаў: «Марыя Андрэеўна, ведаеце, я ў пераўцялесненне не веру, але веру, што нам дадзена ад Бога перажыць нашае жыццё не раз, — не ў тым сэнсе, што вы памрэце і зноў верне-

цеся да жыцця, а ў тым, што цяпер з вамі адбываецца. Калі Вы былі маладой, вы, у вузкіх межах свайго разумення, часам рабілі нядобра; і словам, і думкай, і дзеяннем бэсцілі сябе і іншых. Потым вы гэта забыліся і ў розным узросце працягвалі ў меру свайго разумення дзейнічаць падобным чынам, зноўтакі, сябе прыніжаць, апаганьваць, бэсціць. Цяпер, калі ў вас больш няма сілаў працівіцца ўспамінам, яны ўсплываюць, і шторазу, усплываючы, быццам гавораць вам: «Марыя Андрэеўна, цяпер, калі табе за восемдзесят год, амаль дзевяноста — калі б ты аказалася ў тым жа становішчы, якое табе цяпер успамінаецца, калі табе было дваццаць, трыццаць, сорак, пяцьдзесят год, ты паступіла б так, як паступіла тады»? Калі вы можаце глыбока зазірнуць у тое, што было тады, у свой стан, у падзеі, у людзей і сказаць: «Не, цяпер, са сваім досведам жыцця, я ні за што не магла б сказаць гэтае забойчае слова, не магла б так учыніць, як я ўчыніла!» — калі вы можаце гэта сказаць усёй сваёй істотай: і думкай, і сэрцам, і воляй, і целам сваім», — гэта ад вас адыйдзе. Але будуць прыходзіць іншыя, яшчэ і яшчэ іншыя вобразы. І шторазу, калі будзе прыходзіць вобраз, перад вамі Бог будзе ставіць пытанне: гэта твой мінулы грэх ці гэта ўсё яшчэ твой цяперашні грэх? Таму што калі вы тады ўзненавідзелі нейкага чалавека і не даравалі яму, не прымірыліся з ім, то тагачасны грэх — вашая цяперашняя грахоўнасць; яна ад вас не адыйшла і не адыйдзе, пакуль вы не пакаецеся».

Магу даць і іншы прыклад такога самага кшталту. Мяне выклікала аднойчы сям'я адной нашай старэнькай бабулькі, яснай-найяснейшай жанчыны. Яна

відавочна павінна была памерці ў той жа дзень. Яна паспавядалася, і напаследак я ў яе запытаўся: «А скажыце, Наташа, вы ўсім і ўсё даравалі ці ў вас нейкая стрэмка яшчэ ёсць у душы?» Яна адказала: «Усім я даравала, апроч свайго зяця; яму я не дарую ніколі!» Я сказаў на гэта: «У такім разе я не дам ваш адпушчальнай малітвы і не прычашчу Святых Таямніцаў; вы сыйдзеце на суд Божы і будзеце адказваць перад Богам за свае словы». Яна кажа: «Я ж сёння памру!» — «Так, вы памрэце без адпушчальнай малітвы і без прычашчэння, калі не пакаецеся і не прымірыцеся. Я вярнуся праз гадзіну», — і сыйшоў. Калі праз гадзіну я вярнуўся, яна мяне сустрэла зіхоткім позіркам і кажа: «Вы мелі рацыю! Я патэлефанавала свайму зяцю, мы пагаварылі, прымірыліся, ён цяпер едзе да мяне, і я спадзяюся, да смерці мы адно аднаго пацалуем, і я ўвайду ў вечнасць, прымірыўшыся з усімі».

Пра жыццё хрысціянскае

Як асноўны прынцып, жыць па-хрысціянску — значыць жыць так, каб па магчымасці, паступова, узрастаючы, нам прыпадабняцца да Хрыста. Мажліва, гэта гучыць дужа страшна; але Збаўца нам сказаў вельмі выразна: Я вам даў прыклад, каб вы ім кіраваліся. І прыклад, безумоўна, улучае ў сябе ўсё Ягонае жыццё, Ягонае мысленне, Ягонае сардэчнае стаўленне да чалавека і да навакольнага свету і да судоў Божых. Гэта ўлучае ўсё, што чалавек сабой уяўляе, і ўсё, што ён можа рабіць. Таму хрысціянскае жыццё не заключаецца проста ў тым, каб завучыць тыя ці іншыя запаведзі і старацца іх выконваць, а ў тым, каб за запаведдзю, за словам, за вобразам знайсці глыбінны сэнс і ўрастаць у гэты сэнс. Гэта я хачу патлумачыць.

Калі мы ўдумваемся ці ўчытваемся ў Стары Запавет, мы бачым, што там дадзены запаведзі, і калі чалавек да канца выконваў гэтыя, указаныя Богам запаведзі, калі ён іх выконваў па сумленні, з усіх сваіх сілаў, усім сваім разуменнем, усім сваім памкненнем да праведнасці — ён перад Богам быў праведны. Але на гэтым усё скончвалася, у тым сэнсе, што ягонае становішча ў дачыненні да Бога было як бы юрыдычным: ён быў «правільным» у сваіх справах. А ў Евангеллі Збаўца выдатна нам гаворыць: Калі вы выканаеце ўсё, прызнавайцеся, што вы —

неключымыя (г.зн. няздатныя) рабы. Значыць, справа не ў тым, каб быць праведным перад Богам праз выкананне запаведзяў, а ў тым, каб за запаведдзю знайсці нейкі свой шлях. А які гэты шлях?

Хтосьці з духоўных настаўнікаў казаў: для таго, каб рухацца наперад у духоўным жыцці, трэба безумоўна верыць свайму настаўніку. І далей ён тлумачыў, што вера свайму настаўніку заключаецца ў тым, каб, па-першае, знайсці такога і ўгледзець у ім вобраз, якім варта кіравацца; знайсці такога чалавека, да якога можна прыслухоўвацца і ў паслухмянасці якому можна вырасці па-за межы ўласнай меры. І калі я кажу пра паслухмянасць, я менавіта кажу не пра тое, каб па-рабску выконваць тыя ці іншыя правілы жыцця, а пра тое, каб услухоўвацца. Слова «паслухмянасць» ад слова «слухаць». Адносіны настаўніка і вучня менавіта ў тым і заключаюцца, што вучань услухоўваецца ў свайго настаўніка — і не толькі проста і фармальна ў ягоныя словы, а страецца ўразумець думкі, досвед, разуменне, веды, пачуццё, якімі прадыктаваны тыя ці іншыя ягоныя словы. І дзякуючы гэтаму, чалавек можа як бы паступова перарасці свой досвед і далучыцца да досведу свайго настаўніка.

У крайнім дачыненні, адзіны наш настаўнік — Хрыстос; Ён Сам пра гэта нам гаворыць: Я — адзіны ваш Настаўнік, Я — адзіны ваш Вучыцель... І таму калі Хрыстос дае нам запаведзь, Ён не толькі паказвае, што рабіць; Ён нам гаворыць: вось так рабіў бы натуральна рухам сэрца, упэўненасцю розуму, складнасцю усёй сваёй істоты чалавек, які духоўна цэльны і здаровы... І каб вырасці ў гэтую меру цэльнасці,

трэба пачаць з таго, каб навучыцца, як рабіць, як думаць, як адчуваць — на прыкладзе свайго настаўніка. Але «апраўдаць» сябе тым, што, дзеючы пэўным чынам, я бываю «правільным» перад Богам, нельга, таму што «правільным» чалавек не бывае; і не таму, што ён ніколі не можа апраўдацца, а таму што не ў гэтым справа: запаведзь нам дадзеная, каб мы маглі вырасці ў новую меру разумення і ў новыя вымярэнні жыцця.

Таму, калі мы гаворым пра тое, каб жыць па-хрысціянску, гаворка ідзе не аб тым, каб жыць па-хрысціянску, гаворка не аб тым, каб у Евангеллі ці наогул у Новым Запавеце знайсці ўсе правілы, якія былі ўказаныя Збаўцам Хрыстом, апосталамі — і іх выконваць. Немажліва ж механічна выконваць правіла, да якога ты душой ніякім чынам не далучаны.

Я памятаю выпадак; мне яго распавяла дачка чалавека, пра якога ідзе гаворка. Гэта быў веруючы хрысціянін, цвёрда ўпэўнены, што ён павінен выконваць кожную запаведзь Хрыстовую; як умеў, ён так і рабіў. Але вось адзін прыклад таго, як ён падыходзіў да гэтага выканання. Ён быў чалавекам заможным, дом у яго быў добры, падлога нашараваная. Калі да яго ў дзверы грукаўся жабрак, ён яму адчыняў, спыняў бедака на парозе і казаў: «Стой, дзе стаіш, не лезь у вітальню сваімі бруднымі ботамі». Потым ён выносіў яму талерку супу са скарынкай хлеба і казаў: «Еш — але на дварэ». Калі з ежай было скончана, ён яму даваў нейкую капейчыну: «А цяпер сыходзь!» І ён лічыў, што выканаў запаведзь Хрыстову «накармі галоднага». Тэхнічна ён гэта зрабіў: чалавек з'еў хлеб, з'еў суп, атрымаў палушку і сышоў.

А з чым ён сышоў? Ён сышоў, імаверна, з пачуццём, што — так, ён не такі галодны, у яго і шэлег ёсць на будучыню, хоць на адзін абед ці проста на кілішак гарэлкі — ды чалавечага стаўлення ён не сустрэў.

Магу даць і адваротны прыклад, які мяне дужа крануў у свой час. У часы нямецкай акупацыі я выкладаў у Рускай гімназіі ў Парыжы. Сярод выхавацеляў быў дужа суровы, строгі чалавек, які калісь быў маім кіраўніком у летніку; ён быў замкнёны, ні з кім амаль не таварышаваў, і ніхто, уласна, пра яго нічога не ведаў; у прыватнасці, не ведалі, у якой галечы ён сам жыве. Мы атрымлівалі жабрацкі аклад, і тыя з нас, хто мог, проста працавалі дзесьці яшчэ дзеля таго, каб мець магчымасць выкладаць у гімназіі. Ён мала што мог рабіць і па ўзросце, і па здароўі, і па няведанні французскай мовы. І вось карціна: хлопчыкі, дзяўчаты бягуць у школу, ідзе туды ж і гэты выхавацель. Ля дарогі сядзіць жабрак, перад ім — шапка. Шмат народу праходзіць. Некаторыя мінаюць, «не заўважаючы» яго, таму што сорамна паглядзець і не даць нічога. А некаторыя, праходзячы, проста ў гэтую шапку кідаюць грошык, а на чалавека нават не зірнуць. Яны сваё зрабілі; ён для іх не чалавек, ён — жабрак; а жабрак — гэта проста шапка. І вось падыходзіць гэты выхавацель. Ён спыніўся, зняў капялюш і нешта сказаў жабраку, нічога яму не даў, але жабрак ускочыў на ногі, абняў яго, і яны рассталіся. Гэта бачылі дзеці. Калі ён прыйшоў у гімназію, дзеці яго акружылі і засыпалі пытаннямі: «Хто гэты чалавек? Ён што, вам сваяк? Ці знаёмы? Чаму вы знялі капялюш? Вы нічога яму не далі, — чаму ж ён ускочыў і вас пацалаваў?..» — і загналі выхавацеля ў кут, ён вымушаны быў адка-

заць. І ён адказаў прыкладна наступнае: «Я ішоў пешкі з іншага канца Парыжу, бо ў мяне грошай на метро не было; я йшоў па дарозе і здаля бачыў гэтага жабрака; бачыў, як узбоч праходзілі людзі, бачыў, як некаторыя кідалі грошык ў ягоную шапку, нават не зірнуўшы на яго. І я падумаў, што калі я ўзбоч яго прайду і не выяўлю да яго ўвагі, у яго, можа, памрэ апошняя вера ў чалавека: на яго не толькі не зірнулі, але нават не парупіліся ад свайго дастатку самага малога шэлега кінуць яму. А грошай не было! Даваць не было чаго... Я спыніўся і зняў капялюш перад ім, каб ён адчуў, што мы на роўных, што я ў ім бачу роўнага сабе чалавека, а не жабрака, і яму патлумачыў: «Даруйце — я нічога вам не магу даць: у мяне нічога няма...» І гэты чалавек ускочыў і мяне абняў».

Я сам з гэтым жабраком гаварыў і раней, паразмаўляў і пасля гэтай падзеі. І ён мне сказаў, што ніколі яго ніхто не адарыў так багата, так шчодра, як гэты чалавек, які яму не даў нічога, але прызнаў у ім роўнага сабе чалавека, зняў перад ім капялюш, патлумачыў, чаму ён не можа яму дапамагчы, і папрасіў у яго за гэта даравання.

Вось два прыклады: адзін чалавек усё зрабіў паводле запаведзі, іншы як быццам ніякай запаведзі і не выканаў: няма запаведзі, як паставіцца да жабрака, калі няма чаго яму даць. Але ён яго адарыў самым багатым дарам: ён яго ўпэўніў, ён яму даказаў, што ён — чалавек, што да яго можна паставіцца, як да самага знатнага: перад ім зняць капялюш, перад ім выбачыцца, з ім размаўляць, як з роўным... Можна было б нават больш сказаць. Хтосьці з духоўных пісьменнікаў гаварыў пра тое, што жабракі — гэта

нашыя паны, што мы валодаем багаццем толькі дзеля таго, каб ім служыць, што багацце ў нашых руках — не нашае, што нам даручана ім распараджацца так, як Бог бы распарадзіўся: даваць, каб нічога не прыліпала да рук, каб мы нічога не лічылі сваім, каб мы лічылі, што ўсё, што ў нас ёсць, усё без рэшты належыць таму, каму гэта патрэбна.

Вось два прыклады з каментаром пра тое, што выкананне запаведзяў Хрыстовых — не проста справа выканання закону, а штосьці большае: гэта праява Хрыстовага клопату і Хрыстовай любові да тых, каму яна патрэбная, без разбору, не ставячы пытання, ці варты гэты чалавек, не ставячы пытання: ці не хлус ён? — за гэта ён адкажа, а мы адкажам за тое, як мы да чалавека паставіліся.

Да таго ж адносіцца і ўрывак Евангелля, які чытаецца перад Постам: пра Страшны суд, пра авечак і казлоў. І заўжды падкрэсліваецца: вось Страшны суд, вось што будзе грэшнікам, а вось што будзе праведнікам. Але гэта — толькі абоймы аповеду. Сарцавіна аповеду: на якой падставе праводзіцца суд? Хрыстос пытае: Ці ўвёў ты бяздомнага пад свой дах? Ці накарміў ты галоднага? Ці наведаў ты хворага? Ці не пасаромеўся прызнацца ў тым, што ты — сябар і знаёмец чалавека, увязненага ў турму? і г. д. Усе гэтыя пытанні зводзяцца да аднаго толькі: ці быў ты чалавечным ці не? Калі не, то як жа чакаць, што ў тваю нечалавечнасць (калі можна ўжыць такое дзікае слова) можа ўліцца Боства? Як ты можаш перарасці сваю створанасць у прылучэнні да Боскай прыроды? Як ты можаш прылучыцца Богу, калі ты нават не чалавек?.. Не ставіцца пытанне пра тое, ці

верыш ты, і ў што ты верыш; самае асноўнае пытанне, як бы тая глеба, той фундамент, на якім можна будаваць: ты чалавек ці не? Калі ты не чалавек, няма пра што гаварыць нават...

І ў іншым месцы Хрыстос гаворыць: Не ўсякі, хто Мяне будзе называць «Госпадзе, Госпадзе», увойдзе ў Царства Нябеснае, а тыя, хто будзе выконваць волю Айца Майго.

Калі ўсё жыццё хрысціянскае заключаецца ў тым, каб стаць напраўду, праўдзіва чалавекам, тады сапраўды словы Збаўцы: Я вам даў прыклад, каб вы ім кіраваліся, набываюць надзвычайнае значэнне, гранічнае значэнне, таму што Хрыстос Збаўца — не толькі Бог, які стаў чалавекам, Ён у самым поўным адзіным сэнсе Чалавек. Толькі ў той ступені, наколькі чалавек прылучаецца да Бога, ён да канца ёсць чалавекам. Чалавек робіцца дасканалым, калі Бог і ён злучаныя, сталі еднымі. У Хрысце паўната Боства перабывала цялесна. Збаўца быў адначасова ў самым сапраўдным, рэальным сэнсе чалавекам, і разам з тым, у самым поўным сэнсе, Богам. Ён быў чалавек з плоці, з крыві, з душы чалавечай, але нічога ў Ім не было такога, што не было б працята Боскай прысутнасцю. Ён быў Бог, які стаў чалавекам і паказаў нам, што значыць быць чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова. Мы толькі на шляху да таго, каб стаць людзьмі, чалавекамі. І кожны мусіць знаходзіць свой шлях, і гэта вельмі важна. Немажліва ўзяць аркуш паперы і напісаць на гэтым аркушы ўсё тое, чаго ад нас чакае ці вымагае Госпад. Таму што не кожны здольны выканаць усё, і не кожны пакліканы да ўсяго, што ўказана ў Евангеллі: адзін пакліканы да шлюбу,

іншы — да бясшлюбнасці; адзін пакліканы да слова, другі — да маўчання; перачытвайце сказанае ў 12-м і 13-м раздзелах 1-га Паслання да карынфійцаў пра тое, што Дух адзіны, а дары розныя. І святы Серафім Сароўскі гаворыць: каб жыць духоўна, каб вырасці ў сапраўдную меру чалавека, кожны мусіць выбраць тое, што, як ён гаворыць, «яму прыносіць прыбытак». У аднога чалавека сэрца адкрываецца, жыццё вырастае ў поўную меру праз дабрачыннасць, праз міласэрнасць; у другога — праз малітву; у трэцяга, чацвертага, пятага — праз іншыя дзеянні і дарункі. І таму нельга прыпісаць усім аднолькавы і той самы шлях.

Як жа жыць па-хрысціянску? Што нам рабіць? Нам трэба памятаць, што кожны з нас непаўторны для Бога, адзіны, і што Евангелле ёсць — і праз вобраз Хрыста, які вырастае з яго старонак, і праз словы Хрыстовыя — поўным апісаннем усяго таго, што можа чалавека зрабіць Чалавекам. Але кожны, у розныя хвіліны, можа ўцяміць, зразумець і выканаць тое ці іншае, але не ўсё адразу, і не абавязкова (і гэта вельмі важна) тое, што здаецца самым значным, самым важным. Нам усім хочацца брацца за тое, што робіць на нас самае вялікае ўражанне. Мы мусім ад гэтага ўстрымацца: трэба рабіць тое, на што мы цяпер здольныя.

Я памятаю, як мне балюча было, калі ўпершыню я пайшоў да свайго духоўніка, айца Афанасія, да споведзі. Я паспавядаўся яму, як умеў, шчыра, і чакаў, што ён, манах, укажа мне радыкальны шлях: «Рабі гэтае, тое і тое». А тое, што ён сказаў, мяне ўразіла і на хвіліну расчаравала; ён мне сказаў: «Я табе ўкажу,

што ты мусіў бы зрабіць, калі б ты на тое быў здольны». І дадаў: «А цяпер пастой і падумай: што з усяго гэтага ты можаш выканаць? На што ў цябе дастане мужнасці? Што табе дазволяць акалічнасці?» І я яму тады адказаў: «Вось тое малое з вялікага, што я магу выканаць». — «Выканай гэта, і калі ты будзеш верным у малым, Бог цябе паставіць над большым».

І гэта вельмі важны момант: не вышукваць у Святым Пісанні, у Евангеллі, у дзеях Хрыста, у Ягоных словах, у прыпавесцях, у Ягоных стасунках з людзьмі самае вялікае ў надзеі ці, хутчэй, у ілюзіі, што мы можам гэта выканаць. Што ж выбраць, як жа чыніць? Я паўтару зноў тое, што я неаднаразова казаў прыватным парадкам ці на агульных гутарках цягам апошніх сарака з нечым гадоў.

Евангелле раскрывае перад намі вобраз чалавека ў поўным яго маштабе: Хрыста. І ў гэтае быццам люстэрка ўсечалавецтва і чалавечай дасканаласці мы можам зазірнуць з тым, каб пабачыць сябе. Калі мы чытаем Евангелле, прачытанае можа нас ці глыбока параніць, ці засмуціць, ці пакінуць абыякавымі, ці напоўніць радасцю, натхненнем, надзеяй. І чытаючы Евангелле, мы мусім быць праўдзівымі. Гэта нам вельмі нялёгка даецца, таму што нам хочацца бачыць сябе ў найлепшым святле. Але вось мы прачыталі маленькі евангельскі ўрывак. Сэрца затрымцела, сагрэлася, розум неяк прасвятлеў, воля ўся напружылася, у свядомасці толькі адно жаданне: вось гэтак бы жыць! Як гэта цудоўна! Як гэта праўдзіва!.. Калі так мы адгукнуліся на евангельскае слова, гэта значыць, што яно дайшло да нашага сэрца (а сэрца, у творах святых айцоў, не ёсць месцам эмоцыяў: гэта

сама глыбіня нашае душы, сарцавіна нашага быцця). Дайшло, я гэта зразумеў, Бог мне раскрыў тое, што ўжо зародкава (хаця гэта яшчэ трэба ўзрасціць, абараніць, умацаваць) мяне робіць роднасным Збаўцу ў Ягонай чалавечасці і, значыць, ужо ёсць пачаткам маёй прылучанасці да Яго ў цэлым. Калі так маё сэрца адгукнулася, так мой розум прасвятлеў, воля страпянулася, уся мая істота напружылася жаданнем гэтак жыць, адказаць на гэтыя словы ўсім жыццём — я не толькі сябе зведаў, я спазнаў нешта новае пра Бога. Таму калі я да Яго хоць як-небудзь падобны, то, значыць, і Ён да мяне ў нейкай ступені падобны. І спазнаючы сябе, я спазнаў Яго.

Але здараюцца моманты, калі мы чытаем Евангелле, і да нас той ці іншы ўрывак ніяк не даходзіць. Мы яго чытаем вачыма, чытаем розумам — усё разумеем, што там сказана. Але ў нас адчуванне, што гэта нас ніяк не датычыцца. У гэтым трэба сабе прызнацца; не трэба сябе быццам штучна падаграваць, накручваць сябе, каб быццам бы адгукнуцца на тое, на што мы не адгукаемся.

Вы, пэўна, заўважылі, чытаючы Евангелле, што Збаўца гаварыў цэлым натоўпам народу. У гэтым тлуме знаходзіўся чалавек, які Хрысту ставіў пытанне; і Хрыстос адказваў яму, на ягонае пытанне. Але ці задумваліся вы над тым, як на гэта рэагавалі іншыя людзі навокал? Чалавек ставіў пытанне, якое ў ім выспявала, якое ён усвядоміў ужо з выразнасцю; але ў натоўпе былі такія людзі, у якіх гэтае пытанне толькі зараджалася ці саспявала ў рознай ступені. Чуючы пытанне і адказ на яго Збавіцеля, гэтыя людзі прыслухоўваліся, таму што ведалі, што гэта нейкім

чынам іх датычыцца, хаця гэта не быў адказ на іхнае яшчэ «неаформленае» пытанне. Але яны стараліся запомніць гэты адказ, ведаючы, што раней ці пазней гэты адказ вырашыць яшчэ пакуль не народжанае пытанне.

Але былі яшчэ і іншыя людзі, для якіх гэтае пытанне наогул не існавала і якія, напэўна, пацiскалі плячыма, глядзелі адно на аднога і казалі: «Што за бязглуздзіцу гэты чалавек пытаецца? І чаго Ісус яму адказвае? Да таго ж адказвае гэтак жа недарэчна, як і гэты чалавек запытваў, — што гэта за размова? Якое марнаванне часу, бо можна было б больш узнёслыя рэчы казаць?..» Вось да такіх людзей мы таксама часам далучаемся, калі чытаем Евангелле і не адгукаемся.

Але бывае і так, што тыя ці іншыя словы Хрыстовыя ўяўляюцца нам жорсткімі, непрымальнымі, словамі, якіх мы прыняць не можам. Гадоў сорак таму я праводзіў у нашым прыходзе гутарку пра запаведзі шчаснасці: шчасныя вы, калі будуць вас ганьбіць і гнаць і ўсякім словам ліхім несправядліва зневажаць за мяне, радуйцеся і весяліцеся... І я памятаю, адна з нашых састарэлых прыхаджанак сказала: «Ойча Антоніе! Гэта — дзякуй — сабе пакіньце. Я нацярпелася за ўсё жыццё, і мне пакуты досыць. Такой шчаснасці я сабе не жадаю!» Адказваючы мне такім чынам, яна, уласна, адказвала Збаўцу Хрысту: «Тваёй шчаснасці, шчаснасці пакутніка, гнанага, таго, каго людзі не разумеюць, таго, хто стаіць асобна, — гэтае шчаснасці не хачу! Калі Ты яе хочаш — нясі крыж, памірай на Галгофе, — я на Галгофу не пайду, і па крыжовым шляху крочыць не хачу. Я ўжо досыць знаходзілася на гэтым шляху цягам май-

го працяглага і цяжкога жыцця...» Гэтая жанчына была абсалютна шчырая; я ўпэўнены, што Хрыстос прыняў ейныя словы са значна большай гатоўнасцю, чым калі б яна сказала: «Як гэта цудоўна!» — і пальцам не дакранулася б да таго крыжа, які трэба ўзяць на свае плечы і панесці.

І вось, мы павінны чытаць Евангелле з адкрытым розумам, з адкрытым сэрцам, каб, калі мы сустракаемся з учынкам Хрыста, бачым Ягонае стаўленне да людзей, чуем Ягоныя словы, звернутыя да таго ці іншага чалавека, чуем тое, што Ён кажа вучням, тое, што звернута да нас, — бачыць і чуць у праўдзе, унутранай праўдзе і з гатоўнасцю сказаць: «Гэта так, Госпадзе! Гэта пастаўлю сабе ў закон, таму што я цяпер разумею, што гэта, няхай у зародку, унутраны закон майго жыцця. А гэтага я крануць не магу, я проста не разумею, пра што Ты гаворыш; а гэтага я яшчэ прыняць не магу, — ніяк не магу прыняць! Можа, калісьці я дарасту, а цяпер — не!»

І вось, калі б мы маглі знайсці ў Евангеллі няхай адно ці некалькі такіх месцаў, пра якія мы можам сказаць, што ў гэтых словах я быццам пабачыў у люстэрку асобу Хрыста, мы маглі б пачаць жыць па-хрысціянску; не толькі быць выканаўцамі тых ці іншых правілаў, але маглі б вырастаць у сваю меру, па-свойму рабіцца падобнымі Хрысту. Таму што прыпадабненне Хрысту зусім не азначае пераймання штучнага, знешняга: гэта паступовае ўрастанне ў тое, што апостал Павел называе розум Хрыстовы; і калі ён гаворыць пра розум Хрыстовы, ён гаворыць пра думку, пра змест думкі, сэрца, волі Збаўцы Хрыста.

З гэтага мы ўсе можам пачынаць; і нам вядома з жыцій, што многія святыя, многія падзвіжнікі пачыналі свой духоўны шлях, не ведаючы ўсяго, што ведаем мы як людзі пісьменныя. Мы атачаныя словам, якое чуем, якое можам чытаць. Многія падзвіжнікі пачыналі сваё духоўнае жыццё з нейкага аднога выслоўя, якое кранула іхняе сэрца. Напэўна, многія з вас чыталі «Шчырыя расповеды вандроўніка». Яго ўразіла адна фраза ў апостала Паўла: Безупынна маліцеся... І ён стаў шукаць адказу на гэтыя словы, таму што гэтыя словы ўдарылі яму ў сэрца, — і знайшоў яго ў Ісусавай малітве.

Мы ведаем прыклады і іншых людзей, якія пачулі тое, што яны дзясяткі разоў чулі ў царкве ці ад людзей; але ўпершыню пачулі — гэта значыць не вушамі, а нутром, быццам, і пачалі жыць па-новаму. Гэта зусім не значыць, што мы маем права ці што было б разумна сказаць: «Я буду жыць толькі паводле таго, што я ўжо спазнаў». У такім выпадку мы ніколі не перарасцем сябе, тады мы будзем вельмі доўга і марудна расці. Мы жывем у асяродку людзей, якія вось ужо дзве тысячы гадоў слова Хрыстовае, вобраз Хрыстовы прымалі ў сябе і насілі ў сваім сэрцы і ім жылі. І мы можам не толькі ўглядацца ў Евангелле, але ўслухоўвацца ў настаўленні святых айцоў, учытвацца ў іх творы, узірацца як мага больш глыбока і чуйна ў іхнія жыцціі і з кожнай з гэтых сустрэчаў вынесці што-небудзь сабе на карысць.

Апроч таго, ёсць, вядома, і абмежавальныя запаведзі, якія нас папярэджваюць: калі ты па гэтай дарозе пойдзеш, памеркне ў табе святло, скамянее сэрца, ты сыйдзеш са шляху жыцця на шлях смерці.

На гэта таксама трэба звярнуць увагу. Дзесяць запаведзяў Старога Запавету ў гэтым дачыненні з'яўляюцца такім папярэджаннем: гэта шлях жыцця; калі з яго сыйсці, то ўжо ўваходзіш у абсяг паміранне, смерці, у абсяг цемры і разбурэння.

Вось тыя пачатковыя паняткі, якія, мне здаецца, трэба прадумаць, перажыць, да якіх трэба падыйсці, раней чым уступіць у канкрэтны подзвіг духоўнага жыцця. А подзвіг духоўнага жыцця заключаецца ў тым, каб ніколі не заставацца закасцянелым. Падзвіжнік — гэта той, хто пастаянна ва ўнутраным руху, не бязладным, а мэтанакіраваным руху. І каб тое, што мы ўжо ведаем пра жыццё, пра Бога, пра праўду, пра ісціну, пра святасць, стала рэчаіснасцю, трэба дужа шмат змагацца; трэба перамагчы вельмі многае ў сабе дзеля таго, каб шлях Хрыстовы быў гладкі, каб ён быў прамы. Пра гэта гавораць усе падзвіжнікі, указваюць, як дзейнічаць, што рабіць; пра гэта гаворыць Царква ў сваіх богаслужэннях, гавораць пра гэта тыя малітвы, якія мы чытаем пастаянна — раніцой, вечарам, у розных выпадках нашага жыцця.

Змест

3 Ад выдаўцоў
5 Пра хрысціянства
14 Пра царкву
22 Пра таемствы
30 Пра пакаянне
38 Пра споведзь
47 Духоўнасць і духоўніцтва
59 Пра малітву
68 Пра хваробы
74 Пра святасць і духоўнасць
81 Пра шлюб, пра дзяцей
88 Пра смерць
96 Пра жыццё хрысціянскае

ПРА ЦЭНТР «ЭКУМЕНА»

Цэнтр «Экумена» — культурна-асветніцкая ўстанова, заснаваная групай хрысціян-беларусаў, мэтамі якой з'яўляецца распаўсюджанне хрысціянскіх каштоўнасцей, заахвочванне міжхрысціянскага дыялогу, пераклады багаслоўскіх, навуковых і прапаведніцкіх тэкстаў на беларускую мову.

Для тых, хто жадае фінансава падтрымаць працу Цэнтра па перакладзе тэкстаў на беларускую мову, паведамляем банкаўскія рэквізіты Цэнтра:

Атрымальнік плацяжу:
Цэнтр «Экумена»,
юрыдычны адрас: 220007 г. Мінск,
вул. Жукоўскага, д.1, офіс 9.
УНП 191189224

Банк: ЗАТ «БелСвісБанк» код 175,
РКЦ №1: г. Мінск, пл. Свабоды, 4

Разліковы рахунак:
3015028303000 (BYR, беларускія рублі);
3015028303013 (EUR, еўра)
З пазнакай «пераклад на беларускую мову»

РЭЛІГІЙНАЕ ВЫДАННЕ

Антоній, мітрапаліт Суражскі

Быць хрысціянінам

Адказны за выпуск і рэдактар
А. Майдановіч

Падрыхтоўка да друку
З. Строцаў, Н. Васілевіч

Вёрстка
А. Дземчанка

Карэктар
Г. Мыцык

Фонд «Духоўная спадчына мітрапаліта Суражскага Антонія»
Россия, 125252 Москва, ул. Алабяна, д. 17, кв. 135
alenam@orc.ru www.mitras.ru

Падпісана да друку
Фармат 84 × 108 1/32. Папера афсет.
Наклад 5000 экз. Заказ № 27516
Надрукавана ў тыпаграфіі

Гэта найпершы момант у хрысціянскім жыцці:
разам з Богам верыць у чалавека, пачынаючы з сябе самога.

Антоній Мітрапаліт Суражскі

